Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Зьвязда

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XIV
№ 270 (3868)
СЬРАДА, 19 лістапада 1930 г.
Цана нумару 5 кап.
Выходзіць штодзенна за выключэньнем чацьвяргоў

ГОСУДАРСТВЕННАЯ ... Москва, Б-ко экзем. ст

ПЛЕНУМ УДАРНАГА КВАРТАЛУ

Учора адкрыўся 10-ты пленум ЦСПСБ. Пытаньні, якія падлягаюць абмеркаваньню на гэтым пленуме: аб становішчы работы прафсаюзаў БССР, выніку работы прамысловасьці за 1929-30 гаспадарчы год і кантрольныя лічбы на 1931 год і інш. —сьведчаць аб яго выключнай палітычнай важнасьці, робяць гэты пленум і яго пастановы адпраўным пунктам для ўсяго прафсаюзнага руху Беларусі.

Рэканструкцыйны пэрыяд, які выдзяляецца непараўнальным вытворчым размахам рабочае клясы ў справе сацыялістычнае будоўлі, індустрыялізацыяй і калектывізацыяй краіны, сацыялістычным наступленьнем па ўсім фронце, высуноў на даным этапе перад прафсаюзнымі рухам рад новых задач. Гэтыя задачы пастановамі XVI зьезду партыі зводзяцца ў асноўным да рашучага павароту прафсаюзаў «тварам да вытворчасьці», да узмацненьня ўдзелу прафсаюзаў у рэканструкцыі сельскае гаспадаркі, да работы па паляпшэньні матар'яльна-бытовога становішча рабочых, уздыму культурна-палітычнага ўзроўню рабочых мас і да інтэрнацыянальнай работы.

Пасьпяховае выкананьне гэтых задач XVI зьездам партыі поўнасьцю абумоўлена рашучай і КАРЭННАЙ ПЕРАБУДОВАЙ работы прафсаюзаў.

Ці ўлічылі прафсаюзы БССР і ЦСПСБ асноўныя палітычныя задачы, пастаўленыя партыяй перад прафсаюзамі на новым этапе?

Бязумоўна, што ПАЛІТЫЧНАЯ ЛІНІЯ У РАБОЦЕ ЦСПСБ, У АСНОЎНЫМ, БЫЛА ПРАВІЛЬНАЯ. За гэта гаворыць, раней за ўсё, значная работа, якая прароблена кіраўніцтвам ЦСПСБ з бальшавіцкай рашучасьцю ў справе вызваленьня прафсэкцыянальнага апарату ад асоб, якія эрасьліся з формамі і мэтадамі работы, упасьцівымі старому права-апартуністычнаму кіраўніцтву УсеЦСПС, а таксама непрымірымая барацьба зе лініяю партыі, супроць «Томскіны» на VIII зьезьдзе прафсаюзаў усяго Савецкага Саюзу. ЦСПСБ праведзена ўзмоцненая работа па выпучэньні рабочых у савецкі, гаспадарчы і кааперацыйны апарат, маецца зрух у справе падрыхтоўкі кадраў, значны ўдзел рабочай клясы і прафсаюзаў у справе калектывізацыі сельскае гаспадаркі, пасеўных і ўборачных кампаніях, збожжазагатоўках і іншых важнейшых кампаніях. Нарэшце тое, што палітычная лінія ў рабоце прафсаюзаў праводзілася, у асноўным, правільна — пацьвярджаюць і тыя вялізарнейшыя посьпехі, якія ёсьць у гаспадарчым балянсе БССР за першыя 2 гады пяцігодкі ў выкананьні прамфінплянаў і ў росьце сацыялістычнага сакторніцтва і ўдарніцтва ва ўсіх яго вышэйшых формах.

Аднак, ПРЫ ПРАВІЛЬНАЙ, У АСНОЎНЫМ, ЛІНІІ, ПРЫ РАДЗЕ ВЯЛІЗНЫХ ДАСЯГНЕНЬНЯЎ У РАБОЦЕ ПРАФСАЮЗАЎ, ЯК І Ў КІРАЎНІЦТВЕ ЦСПСБ, МАЮЦЦА СУР'ЁЗНЕЙШЫЯ ПРАРЫВЫ. Гэтыя прарывы павінны быць узяты пад агонь самай жорсткай пралетарскай крытыкі і самакрытыкі, як на самым пленуме, так і шырокімі рабочымі масамі на фабрыках і заводах БССР.

З УСЁЙ РАШУЧАСЬЦЮ ПАВІННА БЫЦЬ ПАДКРЭСЬЛЕНА, ШТО Ў РАБОЦЕ ЦСПСБ І ПРАФСАЮЗАЎ НЯМА ЯШЧЭ КАРЭННАЙ АРГАНІЗАЦЫЙНАЙ ПЕРАБУДОВЫ. Недапушчальна марудна, палахліва, нерашуча перабудоўваецца прафапарат. «Цэнтр цяжару работы прафсаюзаў павінен быць перанесены ў іх нізавыя першапачатковыя зьвяны—ударную брыгаду, групу, зьмену, цэх, прадпрыемства» (XVI зьезд). Да гэтага часу гэта важнейшая дырэктыва — аснова сапраўднага павароту «тварам да вытворчасьці» — праводзіцца вельмі слаба.

Такое зьявішча, на фоне вялізарнейшай і невыстарчальнай актыўнасьці рабочых мас, часта стварае становішча, калі прафсаюзы не пасьпяваюць, недапушчальна спазьняюцца са справай узначаленьня і кіраўніцтва ініцыятывай рабочых мас. Гэтым тлумачыцца і недапушчальна марудная перабудова работы вытворчых нарад і зусім нездавальняючая пастаноўка з боку прафорганаў работы і кантролю над ажыцьцяўленьнем каштоўнейшых рабочых прапаноў. Гэтым, нарэшце, тлумачыцца і рад прарываў у выкананьні колькасных і асабліва якасных паказальнікаў прамфінплянаў у 1929-30 г. па значным радзе прадпрыемстваў, (пры адносна пасьпяховым выкананьні прамфінплану па ўсёй прамысловасьці), а таксама і прывы па радзе галін прамысловасьці за 1 месяц бягучага ўдарнага кварталу.

Зусім нездавальняюча пастаўлена справа ўцягненьня шырокіх рабочых мас, рабочай моладзі —ударнікаў у якасьці добраахвотнікаў у работу прафапарату. Буйнейшым недахопам ЦСПСБ і прафсаюзаў БССР у цэлым зьяўляецца адсутнасьць работы з вылучэнцамі.

Рад фактаў, як напрыклад, роспуск за апошні час 2-х цэнтральных праўленьняў саюзаў (Саўгандальспужачых, Нарсувязі), двух райвучкіпрафсаюзаў, нывыцьцё асобных гаспадарчых работнікаў аб аб'ектыўных «труднасьцях», стаўка на самацёк з боку паасобных прафработнікаў, зьявішчы апартунізму ў культрабоце і недаацэнка яе — усё гэта, бязумоўна, сьведчыць аб наяўнасьці правага апартунізму, упасьцівага паасобным зьвеньням і паасобным работнікам прафпруху, аб неабходнасьці ўсямернага ўзмацненьня агня па ўсякіх праўленьнях правай практыкі, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, якія нясумненна тармозяць карэнную перабудову прафапарату.

БЯЗЬЛІТАСНА, ПА-БАЛШАВІЦКУ ЗМАГАЦЦА З РЭШТКАМІ ВУЗКА ЦЭХАВЫХ ТРЭД'ЮНІЯНІСЦКІХ ТРАДЫЦЫЙ І ТЭНДЭНЦЫЙ, БІЦЬ ПА ЗАМКНУТАСЬЦІ, ЗАКАСЬЦЯНЕЛАСЬЦІ, БЮРАКРАТЫЗЬМЕ І ЧЫНОЎНІЦТВЕ І РАНЕЙ ЗА ЎСЁ ПА ПРАВЫМ АПАРТУНІЗЬМЕ, НЕ ПАСЛАБЛЯЮЧЫ АДНАЧАСОВА ЎДАРАЎ ПА «ЛЕВЫХ» ПАЎТРАЦКІСЦКІХ ЗАГІБАЎ — ТАКАВА ВАЖНЕЙШАЯ ЗАДАЧА, КЛЮЧ ДА САПРАЎДНАЙ ПЕРАБУДОВЫ. Гэтамуж павінна садзейнічаць шырока разгорнутая пралетарская самакрытыка.

Як стаіць у прафсаюзах Беларусі справа з самакрытыкай — з гэтай найбольш адточанай зброяй у руках пралетарыяту? Кепска. САМАКРЫТЫКА Ў ПРАФСАЮЗНАЙ РАБОЦЕ СЛАБА РАЗГОРНУТА, І ШТО ГОРШ ЗА ЎСЁ, ЯНА — ДАЛЁКА ЯК ДЗЕЙСНАЯ.

Трэба разгарнуць найшырэйшую хвалю самакрытыкі на фабрыках і заводах, ва ўстановах, вакол кожнага з вучастка ў прафработы і ў першую чаргу вакол кожнай паасобкі, не зважаючы на асобы. Але мала таксама толькі сыгналізаваць і гэтым страхавацца. Трэба дабіцца сапраўднай дзейнасьці самакрытыкі, хутчэйшага выпраўленьня памылак, адсячэньня ўсяго нездаровага.

Прарывы, дапушчаныя ў рабоце праф саюзаў і ЦСПСБ гэтым далёка невычэрпваюцца. Тут трэба яшчэ паказаць на вельмі слабую культурна-масавую, палітыка-выхаваўчую работу, на слабае інтэрнацыянальнае выхаваньне, на далёка яшчэ невыстарчальнае правядзеньне беларусізацыі, на адсутнасьць выхаваўчай работы з асноўнымі кадрамі рабочых, якія вышлі з вёсак, з мястачак, на ўсё яшчэ яўна невыстарчальную работу па паляпшэньні рабочага забесьпячэньня і харчаваньня і ў справе пастаноўкі найшырэйшага масавага рабочага кантролю над каапэрацыяй.

АСАБЛІВА ПАВІННА БЫЦЬ ЗЬВЕРНУТА ЎВАГА НА НЕДАХОПЫ НЕЗАЎСЁДЫ ПОЎНАГА І ВЫРАЗНАГА КІРАЎНІЦТВА ЦСПСБ І Ў ПРЫВАТНАСЬЦІ ПААСОБНЫХ ЯГО КІРАЎНІКОЎ.

Пленум павінен будзе вырашыць рад адказных задач у сувязі з абгаварэньнем такіх актуальных пытаньняў, як вынікі прамысловасьці за мінулы с.-г. год, кантрольныя лічбы за 1931 г., а таксама пытаньні аб кандагаворнай кампаніі. Зусім зразумела, што посьпех практычнага ажыцьцяўленьня ўсіх гэтых задач будзе знаходзіцца ў простай залежнасьці ад таго, наколькі прафсаюзы, пад агнём самакрытыкі, здолеюць карэнна перабудаваць, здолеюць хутчэйшым тэмпам ліквідаваць свае прарывы, здолеюць разгарнуць барацьбу з правым апартунізмам і яго саюзьнікам «левым» ухілам.

Вынікі прамысловасьці за 1929-30 г. сьведчаць аб новых вялізарнейшых дасягненьнях рабочае клясы БССР, пад выпрабаваным кіраўніцтвам КП(б)Б. Гэтыя вынікі, як і нябачаная актыўнасьць рабочых мас, б'юць па правых апартуністых, б'юць па двурушніках, б'юць па бяспрыкладным права-«лявацкім» блёку — б'юць па ўсёй гэтай плядзе—выказьніцы надзей кулака і нэпмана.

Результаты выкананьня прамфінпляну першага месяца ўдарнага кварталу не па ўсіх прадпрыемствах здавальняючыя. Гэта абавязвае нашы партыйныя арганізацыі, гаспадарчыя органы, і ў першую чаргу, прафсаюзы, НЕАДКЛАДНА НАМАГЧЫ ЎСЕ СІЛЫ НА ЛІКВІДАЦЫЮ ПРАРЫВУ ПЕРШАГА МЕСЯЦА І НА ПЕРАКРЫЦЬЦЁ ЯГО. Абавязкова перавыканаць план ударнага кварталу і падрыхтавацца да ўсеўзбраеньні да трэцяга рашаючага году —гэтай задачы павінны быць падначалены ўсе галіны прафсаюзнай работы.

Кампанія заключэньня калдагавораў павінна ў гэтым годзе зьявіцца адказьнейшай масавай палітычна-гаспадарчай кампаніяй двухбаковых канкрэтных абавязацельстваў. Гэта кампанія арганічна ўвязвае задачы вытворчасьці ў выкананьні прамфінплану з задачамі далейшага наўхільнага паляпшэньня матар'яльнага і бытовога становішча рабочае клясы.

Нелга прызнаць праверну, якая зараз праводзіцца, досыць масавай. Яна мае рад істотных недахопаў. Пленум павінен з усёй рашучасьцю адзначыць гэтыя недахопы, з тым, каб перазаключэньне калдагавораў служыла сапраўдным сродкам пагалоўнай мабілізацыі рабочых мас на барацьбу за пяцігодку за чатыры гады. Перазаключэньне калдагавораў павінна выклікаць новы магутны ўздым сацспаборніцтва і ўдарніцтва ва ўсіх вышэйшых формах.

Такавы асноўныя актуальныя задачы, якія павінен вырашыць пленум. Толькі пад агнём самай жорсткай пралетарскай крытыкі ўсіх прарываў і недахопаў у рабоце прафсаюзаў і ЦСПСБ, змагаючыся супроць правага апартунізму і «левакоў», пад няўхільным кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б, пры штодзённай канкрэтнай дапамозе ўсіх партарганізацый — прафсаюзы БССР справяцца з вялізарнейшымі задачамі, якія стаяць перад імі ў рэканструкцыйны пэрыяд.

ВЫНІКІ ДРУГОГА ПЛЕНУМУ ЦКК КП(б)Б

Сучасны этап разгорнутага сацыялістычнага наступленьня на ўсім фронце, выклікае шалёнае супраціўленьне ўсіх клясава-варожых дыктатуры пралетарыяту элементаў.

У абгаворваньні падавучай абвостранай клясавай барацьбы пачалі актывізавацца правыя і «левыя» апартуністы ўнутры нашай партыі. Яны імкнуцца спэкуляраць на труднасьцях, якія зьвязаны з нашым бурным ростам, і зьвярнуць партыю з ленінскіх пазыцый. На гэтай падставе ў апошні час склаўся права-«лявацкі» блёк Сырцова-Ламінадзэ.

Уся партыя і яе кантрольныя органы яшчэ больш павысілі сваю напружаную барацьбу за правядзеньне генэральнай лініі, абараняючы гэтую лінію ад усяго спроб скажэньня, даючы руйнуючы адпор наскоку права-«лявацкага» блёку—гэтай кулацкай агентуры ўнутры партыі — на партыю і яе ленінскае кіраўніцтва.

Вынікі 2 пленуму ЦКК КП(б)Б, які скончыўся гэтымі днямі, прадстаўляюць сабой узор непрымірымага бальшавіцкага змаганьня за адзінства партыі на падставе правядзеньня генэральнай лініі партыі, пад кіраўніцтвам яе ленінскага ЦК, на чале з тав. Сталіным.

У сваёй рэзалюцыі па паведамленьні т. т. **Гея і Калініна** аб унутры-партыйным становішчы, якую мы сёньня зьмяшчаем на старонках «Зьвязды», пленум ЦКК канстатаваў, што права-«лявацкі» блёк Сырцова-Ламінадзэ, які прабаваў двурушніцкай дзейнасьцю атакаваць генэральную лінію партыі і яе ЦК, стаў на шлях падрыву дыктатуры пралетарыяту. Антыпартыйная работа гэтага блёку падрыхтавана барацьбой супроць партыі правых апартуністых, на чале з Бухарыным, Рыкавым і Томскім, якія ўпарта адмоўчваюцца, ня гледзячы на агідныя факты двурушніцкай фракцыйнай работы ў радох партыі (Руцін, Нуйнаў, Каўрайскі, Марэцкі, Сьлянкоў і інш.). Таму пленум пастанавіў, каб у адносінах да ўсіх тых, хто паспрабуе парушаць адзінства радоў партыі, ЦК і ЦКК УсеКП(б) былі ўжыты пастановы XVI зьезду УсеКП(б) аб несумяшчальнасьці поглядаў правых з прабываньнем у радох партыі.

Разам з тым, пленум рашуча выступіў супроць ухілаў ад генэральнай лініі партыі ў нацыянальным пытаньні, у першую чаргу супроць вялікадзяржаўнага расійскага шавінізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, а таксама супроць контр-рэвалюцыйнага беларускага нацыянал-дэмакратызму і іншых шавінізмаў.

Пленум цалкам і поўнасьцю ўхваліў пастановы апошняга пленуму ЦК КП(б)Б аб несумяшчальнасьці падзяленьня поглядаў нацыянал-апартуністых, гэтых «нацыянал-дэмакратаў, тольці з партбілетамі ў кішэні» — з прабываньнем у радох КП(б)Б, а таксама астановы пленуму ЦК КП(б)Б ў адносінах да Ігнатоўскага. Пленум ЦКК КП(б)Б далучыўся да пастановы пленуму ЦК аб накіраваньні пад загад ЦК УсеКП(б) б. сакратара ЦК КП(б)Б тав. **Васілевіча.**

У пастанове па дакладу тав. **Іванова** пленум высунуў перад органамі КК РСІ, як важнейшую штодзенную задачу — арганізацыю масавага кантролю за выкананьнем прамфінплану асобнага кварталу 1930 г. і 1931 году. Пры гэтым пленум падкрэсьліў, што **«роля органаў КК РСІ павінна зьвесьціся ня толькі да ўстанаўленьня і фіксацыі недахопаў, але і да вызначэньня мерапрыемстваў па зьнішчэньні і, галоўным чынам, па выяўленьні ўсіх вытворчых магчымасьцяй і рэзэрваў на прадпрыемствах».**

Абмяркоўваючы даклад тав. **Жолудава** аб папярэдніх выніках чысткі савецкага апарату, пленум ня эмог прайсьці міма паклёпу права-«лявацкага» блёку на савецкі апарат.

Пленум прызнаў, што вынікі чысткі зьяўляюцца лепшым довадам хлусьлівасьці цьверджаньняў антыпартыйнага блёку, бо, ня гледзячы на паасобныя недахопы савецкага і гаспадарчага апарату, якія партыяй і рабочай клясай рашуча перамагаюцца, наш апарат пасьпяхова спраўляецца з вялікімі задачамі рэканструкцыйнага пэрыяду.

Задача органаў КК РСІ—пры актыўным удзеле партыйных, камсамольскіх і прафэсыянальных арганізацый мабілізаваць увагу рабочых і працоўных мас вакол далейшай работы па ачышчэньні і паляпшэньні нашага дзяржаўнага апарату, каб вробіць яго сапраўды ўзорным, найбольш адпавядаючым задачам рэканструкцыйнага пэрыяду.

Па дакладу тав. **Рывінскага** пленум, выходзячы з асноўных задач, пастаўленых перад органамі КК РСІ XVI зьездам УсеКП(б) і XIII зьездам КП(б)Б, зацьвердзіў плян работы ЦКК РСІ на асобны квартал 1930 году і апэрацыйны 1931 год. Пленум цыркова абмеркаваў задачы раённых кантрольных камісій, роля якіх, у сувязі з ліквідацыяй акруг, надавычай узрасла. Пленум прызнаў, што прыняты плян работы надзвычай напружаны і можа быць выкананы толькі пры шырокім прыцягненьні рабочых і працоўных мас, пры тэй умове, калі органы КК РСІ ўсё больш будуць набліжацца да сапраўднага выкананьня сваіх задач, як арганізатараў мас.

Зараз усім кантрольным камісіям КП(б)Б неабходна ўзяцца за выкананьне бальшавіцкіх пастаноў 2 пленуму ЦКК. Чым паўней будуць ажыцьцёўлены гэтыя пастановы, тым больш органы КК РСІ акажуцца на вышыні сваіх задач, як органы, якія стаяць на ахове сталёвага адзінства партыі, і рашучай барацьбой супроць правых і «левых» апартуністых, супроць двурушнікаў і прымірэнцаў забясьпечаць пераможнае выкананьне лёзунгу партыі: «пяцігодка за чатыры гады» — ажыцьцяўленьне генэральнай лініі нашай партыі.

Пуанкарэ-вайна „абвяргае“

Разгром «прамысловае партыі» і выкрыцьцё яе сувязі з французскім генэральным штабам і выдатнейшымі прадстаўнікамі французскага ўраду — гэта для натхніцеляў і арганізатараў узброенай інтэрвэнцыі ня менш, чым разгром цэлай армі. У першы момант французкія капіталістычныя газэты ельбянтажыліся да таго, што наогул нічога не маглі сказаць. Яны падначаваліся нейчаму ўзьдарнаму загаду: ні слова аб найцяжэйшых абвінавачаньнях супроць кіруючых колаў імпэрыялістычнай Францыі. Такі быў першы момант, калі выравалася, ці зусім замаўчаць аб выкрыцьцёх, ці загаварыць? Для тактыкі маўчаньня не хапіла вытрыманасьці. Загаварылі.

Выступіў сам Пуанкарэ з артыкулам пад характэрным загалоўкам «Ліхаманка Эўропы». Пуанкарэ пісаў: «Францыя паказвае прыклад спакою і будзе і надалей трымаць \сябе ў тым-жа духу...».

І так, пасьля кароткага агульнага маўчаньня заклік перш за ўсё да спакою. Свая публіка, перш за ўсё іменна гэтага і патрабуе. За яўна штучным спакоем даволі шырокае разважаньне: «Савецкі Саюз выбраў цяперашні пэрыяд агульнага хваляваньня, каб кінуць бомбу. Агенцтва, ТАСС у апошнія дні распаўсюдзіла па ўсім сьвеце паведамленьне, якое павінна стаць сэнсацыйным. ТАСС перадаў абвінаваўчы акт, складзены Крыленкам супроць некаторага ліку савецкіх грамадзян, абвінавачаных у змове супроць савецкай улады. Пакуль няма нічога, супроць чаго можна было-б супраўдзіць. Савецкі ўрад — у сабе дома гаспадар і мае права ажыцьцяўляць разрэсіі, якія лічыць патрэбным. Але Крыленка імкнецца давесьці, што абвінавачаныя дзейнічалі пры ўдзеле французкага ўраду, які, — як ён адпаўзаецца сьцьвярджаць, — нібыта рыхтаваў узброены напад супроць Расіі. У сувязі з гэтым Крыленка нагла прыблытвае наш генэральны штаб, на чале якога тады стаў генэрал Добеней, супрацоўнік Пэйлевэ. З сапраўднай нясумленнасьцю Крыленка нават называе і Брыяна і мяне... Думаю, што мне няма патрэбы выступаць з абвяржэньнямі недарэчных цьверджаньняў Крыленкі. Але савецкі ўрад, які ня толькі дапускае, але, вілавочна, і заахвочвае падобныя выхадкі з боку сваіх чыноўнікаў, заходзіць надта далёка ва ўменьні падмяняць ролі (??). У той час, як саветы ўцягнулі частку Азіі ў агонь і залілі яе крывёю (?!) (у пяпрашні час агнём ахоплены Інда-Кітай і крывёю заліваг яго французкі імпэрыялізм. Рэдакцыя), у той час, як яны ўтрымліваюць магутную Чырвоную армію і імкнуцца ўсюды (?) выклікаць непаладкі (?!), Францыя мірна завязала з імі дыплёматычныя адносіны і патрабуе ад савецкай улады толькі аднаго — ня ўмешвацца ў яе справы больш, чым яна ўмешваецца ў справы савецкія, значыць, умешваецца (?! Рэдакцыя). Думаю, што Брыян знайшоў жарт Крыленкі ўжо занадта моцным і прасіў нашага пасла ў Маскве зрабіць патрэбныя представленьні высокаму начальству вельмі дасьціпнага пракурора».

Тут, у гэтай тыраде, ёсьць усё, апрача спакою. Тут, наадварот, яўны непакой. Пуанкарэ стараецца падаць свайму твару «добрую міну», адтапырвае пагардліва губу — ня варта, моў, абвяргаць. І ў той-жа час патрабуе дыплёматычнай умяшальнасьці ў справу з боку Брыяна, які таксама фігуруе ў матар'ялах па справе аб падрыхтоўцы ўзброенай інтэрвэнцыі.

— Ня варта абвяргаць. «Але тут-жа ў інтэрв'ю з карэспандэнтам «Юнайтэд Прэс» абвяргае і самым у падзяючайна запальчывым тоне, Пуанкарэ даў інтэрв'ю нашаму прадстаўніку, — паведамляе «Юнайтэд Прэс», — з поваду ўзьнятых у Маскве супроць французкага ўраду абвінавачаньняў, што ён быццам рыхтаваў інтэрвэнцыю супроць СССР. Пуанкарэ характарызаваў усю гэту справу, як «абсалютна ідыётычную выдумку» і адмаўляе ўсякі ўдзел Францыі ў якіх-небудзь змовах супроць Расіі».

Сказана моцна. Людзі, якія спакойна адносяцца да «недарэчных выдумак», так не гавораць.

Але «Юнайтэд Прэс» аказала паслугу Пуанкарэ сапраўды мядзьведжую. Гэта агенцтва, у пошуках ісьціны, зьвярнулася ня толькі да Пуанкарэ, але і да белагвардзейскага генэрала Мілера, што замяняў Кутепава, які ўзьнёсься бясьследна на неба. Пікантна ўжо гэта адно супадзеньне Пуанкарэ і Мілера. Генэрал, само сабой зразумела, заявіў, што «маскоўскія выкрыцьці — гэта хлусьня», але тут-жа, ня вытрымаўшы характару, далаў: «за границай, сапраўды, знаходзіцца 60 тыс. рускіх ваенных, якія заўсёды гатовы выступіць у паход супроць Сталіна». Ён не сказаў на чы сродкі, пад чым камандваньнем рыхтуюцца да паходу гэтыя царскія агрызкі. Аднак, зусім нядаўна ў Парыжы, у прысутнасьці прадстаўнікоў французкага ўраду, адбываўся ваенны парад баявых агрызкаў, так што і бяз слоў ясна было, на чы сродкі праходзіць падрыхтоўка ваеннага паходу.

У нямецкім буржуазным друку ня было повадаў упадаць у паніку і пазбаўляцца языка. Вялікія газэты, якія маюць у Маскве сваіх карэспандэнтаў, могуць спакойна чакаць суда і ўпэўніцца на справе, у якой мэры правільны высунутыя абвінавачаньні.

Аднак, загаварыла клясавае пачуцьцё. Газэта «Гамбургэр Прэмдэнблят» ахотна згаджаецца з тым, што той ці іншы савецкі служачы меў шпіёнскія сувязі з тым ці іншым французам агентам, але выкрыцьцё сувязяй такога роду яшчэ ня служыць падставай, па думцы газэты, для публічнага выкрыцьця. І калі савецкая ўлада не пажадала пакінуць пад спудам выкрытую змову, дык для гэтага, значыць, ёсьць прычыны асобнай уласьцівасьці; гэта жаданьне адцягнуць увагу ад унутраных няўдач (?). Змагаючыся на словах з французкімі імпэрыялістымі, як злосьнымі ворагамі Нямеччыны і зе крытэтальнымі, турэмшчыкамі і вяўмольнымі зіхаремі, друк сапраўды выступіў накорнай служкай французкіх імпэрыялістых. Але, калі французкі імпэрыялізм выступае ў ролі моднага і адкрытага дрэнежніка, які адкідае ўсякі сораг, дык нямецкія палітыкі сьцьвяжаюцца за іні трусьліва і палахліва, як прыхлябацелі імпэрыялізму, што разьлічваюць у часе новай схваткі вырваць адабычу і для сабе. Яны забываюцца, што яны першымі ўпадуць у гэтай схватцы.

(З агляду друку газэты «Правда»)

Фінляндзкі фашызм рыхтуе вайну супроць СССР

Пагроза ўзарваць савецкае паўпрэдзтва

АГІДНЫ ВЫБРЫК ФАШЫСТЫХ

ГЕЛЬСІНГФОРС, 17. Узьнятая за апошні час друкам кампанія супроць савецкага гандлю ўжо дала свае вынікі. Учора фашыстыя дазволі сабе выключны па нагласьці хуліганскі выбрык: фашыстыя выпэцкалі дзёгцем магазын, які гандлюе вырабамі савецкага «Рэзинотреста». Калі служачыя магазыну пачалі ачышчаць намаляваныя фашыстымі на вітрыне магазыну крыжы і надпісы: «прэч рускіх, прэч рускіх тавары», — ля магазына зьявіўся аўтамабіль з некалькімі фашыстымі, якія крычалі: «сьцірайце ці ня сьцірайце — усё роўна савецкі гандаль мы тут зьнішчым». Характэрна, што ўлады ня ўмяшаліся ў гэта і ня ўжылі мер да затрыманьня вінаватых.

Паўпрэдзтва заявіла міністэрству замежных спраў пратэст. Пры патуранньні ўлад, фашыстыя ўсё больш нагледзіць у сваіх выступленьнях, накіраваных супроць СССР. У гадавіну Кастрычніцкай рэвалюцыі паўпрэдзтва атрымала пагражальныя лісты. Па тэлефону паўпрэдзтву пагражалі ўзарваць памяшканьне паўпрэдзтва. Сёньня «Суомэн Сацыял-дэмакраты» друкуе атрыманы ад папусаўцаў ліст, у якім выканком невядомай арганізацыі, якая захавалася пад літарай «Х», заяўляе, што яму даручана ў бліжэйшы час узарваць савецкае прадстаўніцтва, калі савецкія грамадзяне да гэтага часу на вярнуцца на сваю бацькаўшчыну. Са зьместу ліста відаць, што арганізацыя мае выстарчальную колькасьць моцных выбуховых матар'ялаў, якія даны ёй вайсковымі ўстановамі. Установы, якія служаць справе абароны, паводле слоў ліста, таксама, як і «сыпае кіраўніцтва краіны ўхваляюць дзейнасьць папусаўцаў». У лісьце падкрэсьліваецца, што варожыя выступленьні супроць Савецкага Саюзу будуць фашыстымі разьвівацца. Што-ж датычыць адкрытага выступленьня і абвяшчэньня мабілізацыі, — яны, як сьцьвярджае ліст, магчыма будуць адкладзены да зьезду папусаўцаў.

Генштабы дагаварваюцца

ВЕНА, 17. Паводле вестак з Бухарэсту, у лістападзе чакаецца прыезд у Румынію начальніка польскага генштабу. Перагаворы паміж генштабамі ставяць сабе задачай — **УЗМАЦНЕНЬНЕ ВАЕННАГА САЮЗУ ПАМІЖ РУМЫНІЯЙ І ПОЛЬШЧАЙ, СТВАРЭНЬНЕ АДЗІНАГА ВЯРХОЎНАГА КАМАНДВАНЬНЯ САЮЗНЫМІ АРМІЯМІ НА ВЫПАДАК АНТЫСАВЕЦКАЙ ВАЙНЫ, АРГАНІЗАЦЫЮ СУПРАЦОЎНІЦТВА Ў ПРАМЫСЛОВАЙ ГАЛІНЕ І ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЕ — ЭКАНАМІЧНАЕ І ПАЛІТЫЧНАЕ — ТЫЛУ АБЕДЗЬВЮХ КРАІН Ў ВАЕННЫ ЧАС.** (ТАСС).

Працэс б. дэпутатаў беларускага рабоча-сялянскага клюбу

Правакатары, сышчыкі, дэфэнзыва—кіты абвінавачаньня

ВІЛЬНЯ, 17. Як мы ўжо падавалі ва ўчарайшым нумары «Зьвязды» 18-га лістапада павінна было пачацца ў Віленскім акруговым судзе судовая камедыя — расправа польскага фашызму над 4 б. дэпутатамі беларускага рабоча-сялянскага пасольскага клюбу «Змаганьне» і шасьцю супрацоўнікамі Цэнтральнага сакратарыяту гэтага клюбу.

Сёньняшняя буржуазная польская прэса падае некаторыя новыя даныя пра гэты працэс. Як аказваецца ў ліку шасьці супрацоўнікаў сакратарыяту знаходзяцца наступныя асобы: **Мацей Астапчык, 26 год, Міхась Тарасюк—18 год, Якуб Міско — 18 год, Васіль Лукашык — 19 год, Пётр Пятнун — 18 год і Сымон Жытневіч — 36 год.**

Усе падсудныя, паводле вестак польскай прэсы, знаходзяцца ў Стэфанскай турме ў Вільні і абвінавачваюцца па 102 арт. ч. І б. царскага карнага кодэксу, а іменна — у імкненьні да адарваньня Зах. Беларусі і далучэньня яе да БССР.

З боку абвінавачаньня выклікаецца 57 сьведак — розных правакатараў, сышчыкаў і дэфэнзыўшчыкаў — гэтых кітоў фашысцкага правасудзьдзя ў барацьбе як з рэвалюцыйным рухам польскага пралетарыяту, так і нацыянальна вызваленчым рухам працоўных мас Зах. Беларусі і Зах. Украіны.

Характэрна, што фашысцкі суд адхіліў патрабаваньне падсудных даручэньня ім акту абвінавачаньня на беларускай мове, а таксама патрабаваньне азнаёміцца з актамі справы, каб мець магчымасьць выкрываць правакацыю розных дэфэнзыўных служак.

Склад суда наступны: старшыня — судзьдзя Надушкевіч, судзьдзі — Бжозоўскі і Баброўскі. Абвінавачваць будзе, як мы ўжо падавалі, вядомы рэакцыянэр віца-пракурор Зданові.

Абаранаць падсудных будуць адвакаты: Дурач — з Варшавы, Заштовт, Сакевіцка і Шышкоўскі.

Працэс працягнецца некалькі дзён.

* * *

Сам факт адмовы падсудным у азнаямленьні з актамі справы, нарэшце, выклік 57 сьведак-дэфэнзыўшчыкаў і правакатараў, абвінавачаньне падсудных па 102 арт. ч. І, які гаворыць аб выкрыцьці патаемнага сьпіску, а арыштаваныя, належалі як вядома, да легальнай культурна-асьветнай арганізацыі — усё гэта аж надта выразна сьведчыць аб фабрыкацыі польскім фашызмам гэтага працэсу. Працэс гэты патрабны пілсудчыне як прадлог для пачатку кампаніі па разгроме беларускага нацыянальна-вызваленчага руху. Як мы ўжо ўчора адзначалі, працэс гэты зьяўляецца ня проста працэсам над 6. дэпутатамі, як такавымі, а пачаткам паходу супроць усяго нац.-вызваленчага руху ў Зах. Беларусі для падрыхтоўкі тылоў на выпадак вайны з СССР. А што гэта так, дык ня можа быць ніякага сумненьня. Усеукраінскі пагром, які яшчэ і зараз працягваецца, шалёны тэрор у адносінах да рэвалюцыйнага руху ў Польшчы, перанясеньне кампаніі на разгроме нацыянальна-вызваленчага руху з Зах. Украіны ў Зах. Беларусь і нарэшце тая шалёная ваенная падрыхтоўка, якая зараз адбываецца ў фашысцкай Польшчы — аж надта выразна сьведчаць аб тым, што небясьпека ўзброенага нападу на Савецкі Саюз набліжаецца.

Пралетарыят БССР павінен пільна сачыць за кожным рухам польскага фашызму, каб у кожную хвіліну быць гатовым даць адпор нападаючаму ворагу.

Адказ

арганізатарам інтэрвэнцыі

Выклік камісіі садзейнасьці рэдакцыі «Зьвязды» — адказаць на вылазкі шкоднікаў контр-рэвалюцыянэраў дадатковай падпіскай на пазыку «Пяцігодка — за чатыры гады», у мэтах узмацненьня фінансавай базы пяцігодкі, сустрэў гарачы водгук у рабочых масах гораду Менску.

На прадпрыемствах адбыліся сходы, на якіх рабочыя віталі прапанову «Зьвязды» і ўхвалілі правесьці дадатковую падпіску.

На ЧЫРВОНАСЬЦЯЖНАЙ ГАРБАРНІ «БАЛЬШАВІК» адбыўся сход старых рабочых-актывістых заводу, які пастанавіў прыняць выклік «Зьвязды». Цэхавым камітэтам даручана правесьці дадатковую падпіску на пазыку.

Камісія садзейнасьці дзяржрэдыту ЗАВОДУ «ЭНЭРГІЯ» прыняла выклік. Праведзены гутаркі па цэхах.

20 рабочых дадаткова падпісаліся на 840 руб.

Завод «Бальшавік» выкліканы на сацспаборніцтва па лепшай падпісцы.

Камісія садзейнасьці СНК БССР аднагалосна прыняла выклік камісіі садзейнасьці «Зьвязды». Разгарнулася дадатковая падпіска. За дзьве гадзіны падпіска дасягнула 830 р б.

Рабочая кляса на спробы імпэрыялістых і шкоднікаў контр-рэвалюцыянэраў падарваць абароназдольнасьць савецкае краіны, на панікёрскія крыкі права-«лявацкіх» апартуністых аб «непасільных тэмпах», аб «крызісах», адказвае далейшай ударнай работай па выкананьні прамфінплану, укладваньнем сваіх сродкаў у справу хутчэйшай індустрыялізацыі краіны.

НІ АДНЭЙ ТОНЫ МЕРЗЛАЙ БУЛЬБЫ!

Замаразкі пагражаюць адгрузцы.—Чыгунка несваячасова і няпоўнасьцю падае вагоны. Забясьпечыць бесьперабойную падачу ацепленых вагонаў.

Чыгунка затрымлівае адгрузку

Тысячы фурмавак чакаюць вагонаў

Надыйшлі замаразкі. Навісла рэальная пагроза псаваньня бульбы. З раду месц ужо паступаюць весткі аб тым, што бульба псуецца.

Зараз патрэбны самыя сур'ёзныя меры, каб паскорыць адгрузку, каб не затрымліваць падачы вагонаў, каб не стварацъ прббак на станцыях — бульба павінна ў самы хуткі тэрмін прыбыць на месца назначэньня.

Між тым, чыгунка зусім

ПЕРШЫЯ ВЫНІКІ выбараў у польскі сойм

Усё разьвіцьцё прадвыбарчай кампаніі ў фашыстскай Польшчы, якая праходзіла ва ўмовах самага жорсткага бешага тэрору, ужо раней давала нам магчымасьць прадбачыць у асноўным тыя «цуды», якія павінны былі выйсьці з выбарчых урн. Гутарка ідзе аб «цудах», якія здарыліся пад камандай фашыстска-паліцэйскай дыктатуры Пілсудзкага. Было-б вялікай памылкай лічыць лічбовыя вынікі выбараў у буржуазны парламант — пакуль, дакладней фатаграфіяй расстаноўкі клясавых сіл. Тым больш памылкай лічыць колькасныя результаты выбараў у польскі сойм фатаграфіяй таго, што сапраўды адбываецца сярод шырокіх мас Польшчы.

Пілсудзкі сьпяткуе «перамогу». Для кожнага ясна, што характар гэтай выбарчай «перамогі» асьвятляецца перш за ўсё і выключна нябывалым па сваёй лютасьці белым тэрорам. Перад тварам эканамічнага крызісу, у абставінах агульна-палітычнага крызісу, які перажывае Польшча, ва ўмовах калі польскі імпэрыялізм ліквідаванага рыхтуецца да вайны супроць СССР, Пілсудзкі пайшоў на выбары з мэтай умацаваньня пахіснутай фашыстскай дыктатуры, у мэтах палітычнага ўсяе фашыстскае сыстэмы. У выезд кампартыі Польшчы так адзначаў мэту назначаных выбараў у сойм: «... урад Пілсудзкага мрыюзіць у рух усе сродкі дзеля таго, каб разьбіць і дэзарыентаваць масы, а таксама забясьпечыць сацыял-фашызму, накіравана на тое, каб адцягнуць увагу мас ад рэвалюцыйнага змаганьня ў бок канстытуцыйных спрэчак, на тое, каб прыкрыць фашыстскую дыктатуру чым ці іншым сойміным гарнітурам...»

Урад Пілсудзкага, які ніяко залоўта на выбараў пусьнамі свайго дыктатара заявіў, што ён ня можа не перамагчы на кадыдацкіх выбарах, разгарнуў такі тэрор на ўсёй краіне, параўнальна з яким блядне ўсё, што бачылі да гэтага часу працоўныя Польшчы, Зах. Беларусі і Зах. Украіны. Сутнасьць гэтага белага тэрору, які вынікае з усёй палітыкі польскага фашызму, заключалася і заключаецца ў тым, каб вынішчыць, у літаральным сэнсе гэтага слова, кампартыю, каб магутнымі тэрарыстычнымі ўдарамі арабіць немагчымай мабілізацыйную работу КПП сярод шырокіх працоўных мас.

Гэты прадвыбарчы тэрор не насіў свайго звычайнага, штодзённага характару. Ён выяўляўся ў такіх мерапрыемствах фашызму, як карныя экспэдыцыі на Вахоўніи Беларусі і Зах. Украіне, дзе акупанты распраўляліся ня з сотнямі і нават не з пазоўнымі тысячамі, а з дзесяткамі і сотнямі тысяч працоўнага масеньніцтва. Тэрор выяўляўся ў такіх мерапрыемствах ураду, як пагазоўныя вобыскі ў рабочых кварталах гарадоў, як масавыя арышты працоўных на ўсёй Польшчы, як арганізацыя ладу суловых працэсаў з прыжімі катаржнымі прысудамі і т. д., і т. д. Гэтым ўдарам тэрору, цесна зьвязаным з агульнымі, так сказаць, генэральнымі начачамі польскага фашызму, ставілі мэтай разбіць на галаву камуністычны авангард працоўных.

Самы дзень выбараў зьяўляўся днём асабліва вострых атак на шырокія пралетарскія масы. Варта прачытаць толькі сухую зводку падзей за 16 лістапада, каб арэзумець, што «перамога» фашызму вынікае перш за ўсё з бязьмітаснага крывавага залушэньня рэвалюцыйных мас.

Трэба падкрэсьліць в усёй сілай, што тэрор супроць антыфашыстскага блёку праводзіўся і праводзіцца ўсім фашыстскім лягерам, пачынаючы ад Пілсудзкага і канчаючы правадырамі ПНС і беларускіх і украінскіх нацыянал-фашыстаў. Класа супроць класы сталкі і сталь у непрымірымай барацьбе.

Толькі тады, калі мы ўлічым гэты характар прадвыбарчага тэрору, калі мы арэзумеем, што польскі фашызм кідаў усе свае сілы для таго, каб разьбіць рэвалюцыйны лягер, калі мы будзем камэнтаваць, што фашызм, каб атрымаць «перамогу», наводзе загадзя складаную пляну іншу на фальсыфікацыю рэзультатаў выбараў, тольні тады будзе ясным характар лічбовай «перамогі», якую атрымаў Пілсудзкі на выбарах.

Варта прачытаць паведамленьні аб тым, што «усе галасы і ўсе мандаты ад ЗБ і ЗУ атрымаў Пілсудзкі», каб арэзумець усю ілюзорнасьць «перамогі». Можна прадсказаць, як галасавалі працоўныя Зах. Украіны, якіх забівалі і забіваюць у разьмерах, нябачаных да гэтага часу, карныя экспэдыцыі акупантаў! Варта прыпомніць, што яшчэ летам гэтага году на Лідзкіх выбарах пры найпяжэйшых умовах рабоча-селянскі блёк атрымаў 30.000 галасоў і тры мандаты з пяці, варта прыпомніць магутныя выступленьні працоўных сялян у Алекшыцах, Горадзенскай акрузі, каб зразумець «перамогу» Пілсудзкага на «ўсходніх крэсах»! Варта прыпомніць, што Чырвоная Дамброва зьяўлялася і зьяўляецца крэпасьцю камунізму, каб зразумець, што лічба — 22.000 галасоў, паданых у Дамброўскім басэйне на камуністых, гаворыць аб нагнай фальсыфікацыі выбараў з боку фашызму.

Зусім відавочна, што соймавая «перамога» Пілсудзкага ня ў стане вырашыць эканамічнага і палітычнага крызісу, які ўсьцяж завастраецца і паглыбляецца ў Польшчы. Але таксама зусім відавочна, што сьледам за гэтай соймавай «перамогай» пасьледуе яшчэ больш шалёнае, разгорнутае наступленьне польскага фашызму на рабочую клясу, на працоўнае селянства, на прыгнечаныя народы і іх правадыра—кампартыю, што яшчэ больш актыўна будзе разгортвацца падрыхтоўка ўзброенай інтэрвэнцыі супроць СССР, падрыхтоўка практычная выкананьня вялікіх плянаў.

Ясна, што ў адэцыі вынікаў выбараў мы ня можам абмежавацца толькі адэкай характару «перамогі», якую па колькасных, вонкавых выніках атрымаў Пілсудзкі. Выбары паказалі абсалютную правільнасьць таго аналізу, які даваў у адэцыі настроэў шырокіх працоўных мас гораду і вёскі апошні V зьезд КПП.

Што мы маем у Польшчы і што яшчэ і яшчэ раз з усёй яскравасьцю падкрэсьлілі скончаныя выбары ў сойм?

Па-першае, ня гледзячы на ўвесь тэрор, на тую жорсткую вайну, якую разгарнуў Пілсудзкі пры актыўнай дапамозе сацыял- і нацыянал-фашыстых супроць лягеру рэвалюцыі, уплыў кампартыі Польшчы расьце, сілы камунізму ў шырокіх масах мацнеюць. Канцэнтраваны ўдар фашыстска-паліцэйскага тэрору ахвяры рэвалюцыйнымі масамі Польшчы, ЗВ і ЗУ, піраванымі нашай братняй КПП. Гэты ўдар ня толькі адбіты, але працоўныя масы на ўдар адказалі ўдарам, адказалі разгортваньнем контр-наступленьня і наступленьня супроць фашыстскае дыктатуры.

Польскаму фашызму не ўдалося разьбіць КПП. Наадварот — уплыў кампартыі значна вырас у масах. У гэтым заключаецца найлыбейшы палітычны сэнс рэзультатаў на толькі і ня столькі саміх выбараў, колькі ўсяе выбарчае кампаніі, усяго ходу клясавага змаганьня, якое разгортваецца і абастраецца.

Па-другое, катастрафічна падаюць уплывы ў масах — галоўнага ворага кампартыі ў рабочай клясе і працоўных масах сялянства — Цэнтралеву і, перш за ўсё, ППС. Цэнтралеў пацярпеў буйное палітычнае паражэньне на выбарах. Гэта паражэньне ППС і ўсяго Цэнтралеву зьяўляецца цічым іншым, як перамогай камунізму, як паслабленьнем сіл фашызму. ППС растарпула ў часе выбарчай кампаніі шырокую апазыцыйную, «левую» дэмагогію. Увесь Цэнтралеў прабаваў у сваёй прадвыбарчай кампаніі зьвесьці працоўныя масы на шляхі «дэмакратычнай дыверсіі і такім чынам разьбіць іх у барацьбе з фашыстскай дыктатурай». Які-ж рэзультат? Рэзультат яркі выяўляецца ў тых лічбовых выніках выбараў, перш за ўсё ў рашаючых рабочых цэнтрах Польшчы — Варшаве, Лодзі, Дамброўскім басэйне, якія не ўдалося ўтаіць нават фашыстскаму тэрору. Ва ўсіх гэтых трох цэнтрах камуністы атрымалі значную пераважную большасьць галасоў параўнальна з ППС.

КПП б'е ППС і Цэнтралеў у важнейшых рабочых крэпасьцях Польшчы. Гэта адзін з самых важных, самых рашаючых палітычных вынікаў выбараў. Тыя рабочыя, якія да гэтага часу яшчэ шчыра вярылі ў «левую» фразу ППС, пераконваюцца ў поўным банкрутстве сацыял-фашыстскіх служак Пілсудзкага і пераходзяць у лягер камунізму. Так, у выбарчай акрузе № 189 (Чэрнякоўская вуліца — рабочы раён Варшавы) — камуністы атрымалі 555 галасоў, Цэнтралеў — 115. Выбарчая акруга № 99 (Лешно рабочы раён) камуністы — 320 галасоў, Цэнтралеў — 7, пілсудчыкі — 112. Выбарчая акруга № 88 (Даіна вул. — рабочы раён) камуністы — 486 галасоў, Цэнтралеў — 18, Бунд — 120, Пілсудзкі — 173. Такім чынам, у радзе важнейшых рабочых раёнаў камуністы ідуць пераважнай сілай у пралетарскіх масах. Надзвычай цікавым зьяўляецца той факт, што адзіным прадстаўніком пралетараў Варшавы ў сойме будзе толькі камуністы. Пілсудзкі згубіў свой апошні мандат у сойме ад Варшавы.

Мы ўжо адзначалі вышэй, што, ня гледзячы на ўсе фальсыфікацыі і тэрор, — рабоча-селянскі блёк вышаў в палітычнай перамогай. Толькі так можа стаць пытаньне пры агульнай адэцыі ўсе выбарчае кампаніі. Зразумела, што нельга падыходзіць да лічбаў фашыстскай выбарчай арытмэтыкі ізаляванна ад усёй абстаноўкі абвастранай клясавай барацьбы ў краіне, ад усёй тэй вялікай палітычнай кампаніі, якую правяла КПП перад выбарамі ў самых шырокіх масах працоўных.

Палітычны баланс прадвыбарчай кампаніі — узмацненьне ўплыву партыі ў масах, ня гледзячы на шалёны тэрор, не сувязі з фабрыкамі і заводамі, прыкінуценьне ў новыя раёны, падзеньне ўплыву ППС—ярка гаворыць аб тым, што кампартыя выйшла з выбараў з перамогай.

Усё вялікае значэньне гэтай перамогі будзе асабліва ясным, калі мы ўлічым, што кампартыя Польшчы ішла на выбары з разгорнутай праграмай пралетарскай рэвалюцыі, як адзінага спосабу да вырашэньня крызісу. Працоўныя масы, якія пайшлі за кампартыяй, ішлі за гэтай ня праграмай, выступалі за рабоча-селянскі савецкі ўрад, за рэвалюцыйнае зьвяржэньне фашыстскай дыктатуры.

Буйное палітычнае значэньне набывае ўся выбарчая кампанія польскай кампартыі і рад не носьнехаў і перамог ва ўмовах небясьпекі антысавецкай вайны. Мы ведаем з паказаньняў правадыроў «прампартыі» аб тым, якую ролю павінна будзе адыгрываць Польшча ў антысавецкай інтэрвэнцыі. Працоўныя Польшчы і яе авангард — КПП змагаюцца на самым адказным участку міжнароднага рэвалюцыйнага фронту. Дэманстрацыя сілы камуністычнае партыі — гэта дэманстрацыя тэй рэвалюцыйнай арміі, якая як адзін выступае ў абарону Савецкага Саюзу і як адзін аддасьць сваё жыцьцё справе ажыцьцяўленьня ленінскага лёзунгу — ператварэньня імпэрыялістычнай вайны ў вайну грамадзянскую. Нягай не забываюць аб гэтым арганізатары і натхняльнікі новай інтэрвэнцыі!

Тыя посьпехі, якіх дабілася кампартыя Польшчы на пройдзеным этапе клясавага змаганьня, былі магчымы толькі дзякуючы правільнай бальшавіцкай лініі, якую ажыцьцяўляе партыя і яе Цэнтральны Камітэт. V зьезд КПП, які адбываўся незадоўга да выбараў, стварыў тыя неабходныя прадпасылкі, якія робяць нашу брацкую польскую партыю — сапраўды баляздольнай, бальшавіцкай і згуртаванай. V зьезд, які нанёс руйнуючы ўдар па правай групе польскае партыі (Варскі, Кастшэва, Лапінскі), які мабілізаваў партыю для далейшай рашучай барацьбы супроць правага апартунізму і «левага» авантурызму, стварыў падставу для бальшавіцкага аладзіства, стварыў тую абстаноўку, якая дала магчымасьць гэраічнай КПП правільна вырашыць стаўныя перад ёй задачы і правільна разгарнуць у даным выпадку усю выбарчую кампанію.

Вразумела, што ні выбары ў сойм, ні новы сойм, ні дэмакратычная балбатня апазыцыйных партый ня вырашаць крызісу, якім ахоплена фашыстская Польшча. Польшча ўступае зараз у парыяд новых, яшчэ больш вострых клясавых баёў. Перад нашай братняй кампартыяй Польшчы паўстаюць гістарычнай важнасьці задачы. ... «Указваючы масам на прыклад вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі, на заваёвы 12 год дыктатуры пралетарыяту, на разьвіцьцё сацыялістычнага будаўніцтва, прапінаставляючы тэтаму вынікі 12 год буржуазных урадаў, 4 год фашыстскай дыктатуры — партыя разгортвае перад масамі праграму пераможнай пралетарскай рэвалюцыі ў Польшчы, партыя пераконвае масы, што няма для іх іншага выхаду з крызісу, як зьвяржэньне фашыстскае дыктатуры, шляхам узбраенага паўстаньня і ўстанаўленьня дыктатуры пралетарыяту», — так зусім правільна паказвае V зьезд КПП тыя асноўныя шляхі, па якіх павінна разгортвацца і разгортваецца работа кампартыі Польшчы.

Вядучы бязьлітасную барацьбу супроць правага ўхілу, ці галоўнай небясьпецы, супроць яго прадстаўнікоў у партыі — групы Варскага-Кастшэвы, дамагаючы прымірэнцаў і двурушнікаў, даючы адпор «леным» фразам, КПП, на кіраўніцтвам свайго ЦК, будзе пабальшавіцку і надалей вырашаць усе задачы падрыхтоўкі і арганізацыі пралетарскай рэвалюцыі ў Польшчы.

Лінія „найменшага супраціўленьня“

ГРУБЫЯ СКРЫЎЛЕНЬНІ ЛІНІІ ПАРТЫІ, ДАПУШЧАНЫЯ Ў РАДЗЕ МЕСЦ У АДНОСІНАХ КАЛГАСАЎ, ПАГРАЖАЮЦЬ РАЗЬВІЦЬЦЮ СПЭЦЫЯЛІЗАВАНЫХ ГАСПАДАРАК, ДАПАМАГАЮЦЬ КУЛАЦТВУ

Надаўна Калгасцэнтр БССР атрымаў вымову за недапушчальнае адставаньне калгасных сыстэмы ў выкананьні пляну загатовак збожжа і бульбы. Загатоўкі па калгасах праходзілі самацёкам, а калгасныя органы ня прымалі рэальных мер да напежнага іх узмацненьня. Раённыя арганізацыі абмежаваліся ролямі спакойных глядачоў, лічачы, што «ў калгасах мы заўсёды зможам узяць».

Вестні з месц за апошнія дні не даюць пакуль малюнку перапому ў калгасах. Мясцовыя арганізацыі і ў першую чаргу райкалгасаюзы, бясспрэчна, яшчэ не разгарнулі належнай масавай работы сярод калгасьнікаў за неадкладнае і поўнае выкананьне загатовак.

Але разам з тым, З РАДУ МЕСЦ УЖО СЫГНАЛІЗУЮЦЬ, ШТО АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЕ ДЫРЭКТЫВЫ ПАРТЫІ АБ ЗАГАТОЎКАХ У КАЛГАСАХ ГРУБА СКАЖАЮЦЦА, ШТО РАЁНЫ «БЯРУЦЬ» У КАЛГАСАХ СТОЛЬКІ, СКОЛЬКІ НЕ ХАПАЕ ДЛЯ ВЫКАНАНЬНЯ УСЯГО РАЁННАГА ПЛЯНУ. Частка раённаў ідзе па лініі найменшага супраціўленьня, не разгортваючы работы сярод адзінаасобнікаў і не арганізуючы націску на кулака, а звальваючы большую частку загатоўчых плянаў на сацыялістычны сэктар. Правааапартуністычная практыка тут характарызуецца таксама прымірэнчымі адносінамі да кулака, ідзе побач з перагібамі ў адносінах да серадняка і нават бедняка.

Гомельскі РВК разьвярстаў заданьне па збожжазагатоўках у 700 тон наступным чынам: 300 тон павінны даць калгасы, 400—адзіныаасобнікі. І гэта ў той час, калі калгасы раёну яднаюць усяго каля 10 проц. двароў. Кулака-ж бялцца «пакрыўдзіць». Цьвёрдыя заданьні кулацка-заможнай часткай вёскі ня выконваюцца, і ад гэтым наогул ніхто сур'ёзна не клапоціцца.

Такі-ж малюнак нагляднецца ў Старобінскім, Брагінскім і іншых раёнах. Рэкорд галавацяпства, аднак, пабіў Круглянскі раён. КАЛГАСАМ, ЯКІЯ ЯДНАЮЦЬ КАЛЯ 17 ПРОЦ. ДВАРОЎ. ДАНА ЦЬВЁРДАЕ ЗАДАНЬНЕ—ВЫКАНАЦЬ 42,1 ПРОЦ. УСЯГО РАЁННАГА ПЛЯНУ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК. ПРЫЧЫМ, ЗАДАНЬНЕ НЕ ПАДЗЕЛЕНА НА АБАВЯЗКОВУЮ І НЕАБАВЯЗКОВУЮ ЗДАЧУ.

На адзін калгасны двор у сярэднім прыпадае каля 6 цэнтн. збожжа, у той час, калі на адзін адзінаасобны двор—толькі 1,5 цэнтн.

На прыходзіцца даводзіць вялізарнай шкоды, якую наносіць калгаснаму руху такая палітыка некаторых раённых арганізацый, якія фактычна ліквідавалі пераваг, даныя калгасам партыяй і савецкім урадам. Калгасам Круглянскага раёну загадана было здаць у абавязковым парадку ў тры разы больш, чым гэта прапанавалася цэнтрам. Прадастаўленьне такіх «пераваг» калгасам дало нозыр у рукі кулака, які скарыстаў грубыя перагібы мясцовых арганізацый для разгортваньня антыкалгаснай агітацыі.

Ня дзіва, што ў радзе калгасаў няправільна падыходзяць да пытаньня аб добраахвотнай здачы калгасьнікамі лішкаў той долі ўраджаю, якая ім належыць, калі самі раённыя арганізацыі порушаюць устаноўленыя дырэктывамі партыі прынцыпы. Замест таго, каб весьці масавую работу сярод калгасьнікаў за добраахвотную здачу лішкаў дзяржаве, яны займаюцца адміністраваньнем, адным росчаркам пяра зьвяртаючы — прапануючы — «здаць столькі». Круглянскія-ж галавацяпы падышлі да пытаньня з выключнай лёгкадумнасьцю, даўшы калгасам пляны, якія яўна парушаюць гаспадарную роўнавагу калгасаў. Характэрна, што пасьля ўмяшальнасьці прадстаўніка Калгасцэнтру, круглянскія арганізацыі зараз-жа зьнізілі заданьне калгасам з 575 да... 243 тон, з якіх абавязковых толькі 189 тон.

Асабліва частымі сталі перагібы ў адносінах калгасаў у сувязі з бульбазагатоўкамі. Трэба сказаць, што гэтая важнейшая кампанія праходзіць яшчэ незадавальняюча па рэспубліцы ў цэлым, хаця некаторага зруху ўжо мы дабіліся. БССР—АДЗІН З АСНОЎНЫХ ПАСТАЎШЧЫКОЎ БУЛЬБЫ ДЛЯ ЎСЯГО САЮЗУ, БУЛЬБУ ТРЭБА АДГРУЖАЦЬ ЗВЫШЭЙШЫМІ ТЭМПАМІ, БО ЎЖО НАБЛІЖАЮЦЦА ЗАМАРОЗКІ, але раённы і калгасная сыстэма яшчэ ня ўжылі рашучых мер, якія забясьпечвалі-б поўнае і своячасовае выкананьне заданьня. Кулацка-заможны двор цьвёрдых заданьняў няў у радзе месц ня выконвае, або выконвае вельмі слаба, а каб прымусіць яго да гэтага, рэальна робіцца вельмі мала. Масавая кампанія сярод адзінаасобнікаў—середнякоў і беднякоў за здачу лішкаў дзяржаве радка дзе вядзецца з патрэбнай энэргіяй. Дрэнна выконваюць пляны і калгасы.

Зараз, калі ўзмацніўся націск з боку цэнтру, многія раёны імкнуцца вырашыць задачу вельмі проста—націскаючы на калгасы. Прычым, пытаньне НЯ СТАВІЦЦА ТАК, што калгасы не накаючы ні адной хвіліны, гавінны здаць лішкі бульбы, пакінуўшы сябе такую колькасьць, якая сапраўды патрэбна для забясьпячэньня кармавой базы. Раённыя арганізацыі перагнулі палку, усім сваім цяжарам навіўшыся на калгасы сэктар, патрабуючы, каб ён выручыў раённы плян, каб ён расплачваўся за апартуністычную бязьдзейнасьць мясцовых арганізацый у адносінах кулацка-заможнай часткі вёскі.

Зусім відавочна, што адны калгасы ня могуць запоўніць шчыліны ў раённым бульбазагатоўчым пляне без таго, каб не разбурыць сваю кармавую базу, асабліва ў спэцыялізаваных калгасах.

Да чаго дайшло галавацяпства ў некаторых раёнах сьведчаць наступныя факты. На заўвагу члена праўленьня Калгасцэнтру БССР т. Брытавай, што калгасам прыходзіцца выконваць плян бульбазагатовак за лік адгрузкі частка кармавога фонду, кіраўнікі арганізацыі Койданаўскага раёну адказалі:

— Зараз бульбу забярэм, а потым дамо. Нам загадана адгрузіць. Загад павінен быць выкананы, і ўсё.

У Азарыцкім раёне калгасам натэгарычна запрапанавана адгрузіць 30 проц. усяго свайго валавога ўраджаю бульбы, у той час, як БССР у сярэднім адгружае толькі 14 проц. Спэцыялізаваныя сьвіноводныя і жывёлагадоўчыя калгасы гэтага раёну літаральна застаюцца зусім бяз бульбы.

Аб аналёгічных фактах паведамляюць з Слуцкага, Клічаўскага і інш. раёнаў. Ніякія довады райкалгасаюзаў аб тым, што такія перагібы адмоўна адаб'юцца на разьвіцьці спэцыялізаваных калгасаў, ня прымаюцца пад увагу. Не дапамагаюць і спасыланьні на зусім ясныя і катэгарычныя дырэктывы—пры правядзеньні бульбазагатовак абавязкова ўлічваць кармавыя патрэбы ў спэцыялізаваных гаспадарках.

Неабходна прыняць самыя рашучыя меры, каб фарсаваць той пералом, які мы маем у справе адгрузкі бульбы і ў бліжэйшыя-ж дні цалкам выканаць плян адгрузкі, але трэба рашуча ударыць па спробах ажыцьцявіць гэтую задачу, ідучы па лініі найменшага супраціўленьня, г. зн. навальваючыся на калгасы, і па лініі праваапартуністычнай практыкі, прымірэнча адносячыся да кулака, не вядучы ніякай работы сярод адзінаасобнікаў-беднякоў і сераднякоў.

НЕАБХОДНА ВЕСЬЦІ БАРАЦЬБУ З ІМКНЕНЬНЕМ НЕКАТОРЫХ КАЛГАСАЎ УТАІЦЬ СВАЕ САПРАЎДНЫЯ ТАВАРНЫЯ ЛІШКІ ХЛЕБА І БУЛЬБЫ, З ЗАЦЯГВАНЬНЕМ ТЭРМІНУ ВЫКАНАНЬНЯ ЗАГАТОЎЧАГА ПЛЯНУ, але яшчэ больш рашучую барацьбу трэба весьці з галавацяпамі, якія шляхам націску на калгасы, забіраюць у іх ня толькі таварныя лішкі, але і кармавыя фонды, што робіць немагчымым ажыцьцяўленьне дырэктыў аб разьвіцьці сьвіноводзтва і жывёлагадоўлі. На барацьбу з такой праваапартуністычнай практыкай, якая вядзе да зрыву мерапрыемстваў партыі ў абслугу хутчэйшага вырашэньня мясной праблемы, трэба мабілізаваць увагу партарганізацый.

Ул. Л.

ЗА ЛІНІЮ ПАРТЫІ

ПЛЕНУМ ЦКК ПАТРАБУЕ АД БУХАРЫНА, РЫКАВА, ТОМСКАГА АКТЫЎНАЙ БАРАЦЬБЫ СУПРОЦЬ ПРАВЫХ І „ЛЕВЫХ“ АПАРТУНІСТЫХ

РЭЗАЛЮЦЫЯ ПЛЕНУМУ ЦКК КП(б)Б

I.

Пленум ЦКК КП(б)Б адзначае, што разгорнутае сацыялістычнае наступленьне па ўсім фронце, рашучае правядзеньне палітыкі ліквідацыі кулацтва, як класы, на аснове суцэльнай калектывізацыі, гіганцкія посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва, якія дасягнуты рабочай клясай пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, выклікаюць шалёнае супраціўленьне супроць дыктатуры пралетарыяту з боку ўсіх варожых сіл (акадэмічная блёкада, шкодніцтва, падрыхтоўка нападу на СССР), якія прабуюць сарваць будаўніцтва сацыялізму і знішчыць краіну дыктатуры пралетарыяту.

У гэтых умовах абвостранага клясавага змаганьня, пры наяўнасьці труднасьцяй сацыялістычнага росту, ажывілі свае дзейнасьць апартуністычныя элемэнты ўнутры нашае партыі, паднялі галаву і правыя і «левыя» апартуністыя, якія імкнуцца гнусная спэкуляцыяй на нашых труднасьцях сьцягнуць партыю з ленінскіх пазыцый.

На гэтай-жа падставе склаўся ў апошні час гнілы бяспрынцыпны правa - «лявацкі» блёк Сырцова - Ламі надзэ, які імкнуўся антыпартыйнай, раскольніцкай, двурушніцкай дзейнасьцю атакаваць генэральную лінію партыі і ленінскае кіраўніцтва ЦК на чале з т. Сталіным, стаўшы гэтым самым на шлях падрыву дыктатуры пралетарыяту.

Гэта антыпартыйная работа правa-«лявацкага» блёку падрыхтавана змаганьнем супроць партыі правымі апартуністымі на чале з Бухарыным, Рыкавым і Томскім. Упартае маўчаньне былых підэраў правых перад наяўнасьцю агідных фактаў двурушніцкай, фракцыйнай работы ў радох партыі (Руцін, Марэцкі, Нусінаў і інш.), сьведчыць аб іх сьвядомым імкненьні стаць прыцягальным цэнтрам для ўсіх сіл, якія змагаюцца супроць генэральнай лініі партыі.

Пленум ЦКК КП(б)Б цалкам і поўнасьцю далучаецца да пастановы Бюро ЦК і прэзыдыуму ЦКК ад 10 лістапада па гэтым пытаньні. Пленум упэўнен, што ЦК і ЦКК УсеКП(б) прымуць у адносінах да Сырцова - Ламінадзэ, Шацкіна і інш. самыя рашучыя арганізацыйныя меры, ня спыняючыся перад выключэньнем іх з партыі, паставіўшы такім чынам пытаньне перад былымі підэрамі правых — Бухарыным, Томскім і Рыкавым, што пры ўмовах, калі яны ня стануць на шлях антыўнага змаганьня за генэральную лінію партыі, супроць апартунізму і, галоўным чынам, супроць правага апартунізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, то ў адносінах да іх будуць ужыты пастановы XVI зьезду УсеКП(б) аб несумяшчальнасьці поглядаў правых з прабываньнем у радох партыі.

Пленум ЦКК заклікае ўсю КП(б)Б да яшчэ большай пільнасьці і ідэёва-арганізацыйнай непрымірымасьці ў змаганьні за генэральную лінію партыі, супроць правага апартунізму, як галоўнай небясьпекі, супроць «левых» апартуністых, супроць двурушнікаў і прымірэнчых адносін да ўхілаў ад генэральнай лініі партыі.

II.

Наступленьне сацыялізму па ўсім фронце і зьвязанае з гэтым завастрэньне клясавага змаганьня выклікаюць «актывізацыю ў радох партыі нацыянальных ухілаў у бок вялікадзяржаўнага і мясцовага шавінізму» (з рэз. XVI зьезду). Галоўнай небясьпекай на даным этапе зьяўляецца вялікадзяржаўны шавінізм, сутнасьць якога заключаецца ў імкненьні абыйсьці нацыянальную розьніцу мовы, культуры, быту; у імкненьні падрыхтаваць ліквідацыю нацыянальных рэспублік і абласьцяй; у імкненьні падараваць прынцыпы нацыянальнай роўнасьці і разьвіваць палітыку партыі па нацыяналізацыі апарату, нацыяналізацыі друку, школы і інш. дзяржаўных і грамадзкіх арганізацый». (Сталін, XVI зьезд УсеКП(б). Разам з гэтым ні ў якім разе не павінна быць аслаблена змаганьне супроць беларускага, польскага, яўрэйскага і інш. шавінізму.

Контр - рэвалюцыйны беларускі нацыянал - дэмакратызм вядзе змаганьне супроць дыктатуры пралетарыяту, за капіталістычную рэстаўрацыю, стварачы агульны фронт з беларускім нацыянал - фашызмам па той бок мяжы (Луцкевіч, Станкевіч і інш.), ён зьяўляецца такім чынам, сустаўной часткай польскага фашызму. Таму пленум лічыць, што змаганьне супроць контр - рэвалюцыйнага беларускага нацыянал - дэмакратызму зьяўляецца неабходнай умовай правядзеньня ленінскае нацыянальнай палітыкі ў БССР.

У радох КП(б)Б выявілася поўная праслойка нацыянал - апартуністых, якія зьяўляюцца агентурай нацыянал-дэмакратызму, карэньні якога зрасьліся з правым апартунізмам.

Пленум ЦКК цалкам і поўнасьцю ўхваляе пастановы пленуму ЦК КП(б)Б па нацпытаньні, пастанову аб несумяшчальнасьці падзяленьня поглядаў нацыянал - апартунізму з прыналежнасьцю да КП(б)Б і пастанову ў адносінах да Ігнатоўскага (вывад яго з ЦК і перадача пытаньня ў ЦКК аб прабываньні яго ў радох КП(б)Б), а таксама пастанову ў адносінах да тав. Васілевіча, аб аслабленьні яго ад абавязкаў сакратара ЦК КП(б)Б.

Пленум ЦКК даручае прэзыдыуму ЦКК і ўсім кантрольным камісіям КП(б)Б весьці бязьлітаснае змаганьне з нацыянал - апартунізмам у радох КП(б)Б, ажыцьцяўляючы пастанову аб несумяшчальнасьці падзяленьня поглядаў нацыянал - апартунізму з прабываньнем у радох КП(б)Б.

Пленум ЦКК адзначае, што да гэтага часу кантрольныя камісіі вялі невыстарчальную работу ў змаганьні за правядзеньне ленінскай нацпалітыкі, таму пленум указвае ўсім кантрольным камісіям на неабходнасьць рашучага ўзмацненьня змаганьня за правядзеньне нацпалітыкі партыі і мабілізацыі КП(б)Б супроць вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, супроць нацыянал-апартунізму, як буржуазнай агентуры у радох КП(б)Б, і супроць іншых шавінізмаў, дабіваючыся ўзмацненьня інтэрнацыянальнага выхаваньня, рашучага ўмацаваньня беларусізацыі і будаўніцтва беларускай культуры, нацыянальнай па зьмесьце, забясьпечыўшы моцнае пралетарскае кіраўніцтва гэтым будаўніцтвам.

Пленум ЦКК выказвае цьвёрдую ўпэўненасьць, што КП(б)Б, як і ўся наша партыя, нанясе руйнуючы ўдар па правым апартунізьме, як галоўнай небясьпецы на даным этапе, па «левым» апартунізьме, права-«лявацкім» блёку, па нацыянал-апартунізьме ў радох КП(б)Б, па двурушніцтве і па прымірэнчых адносінах да ўхілаў ад генэральнай лініі партыі. КП(б)Б у гэтым змаганьні яшчэ шчыльней згуртуецца пад бальшавіцкім кіраўніцтвам ленінскага ЦК УсеКП(б) і яго выпрабаванага правадыра — т. СТАЛІНА і забясьпечыць пасьпяховае выкананьне пяцігодкі за чатыры гады і канчатковую перамогу сацыялізму.

ПАСТАНОВА САКРАТАРЫЯТУ ЦК КП(б)Б

У адмену пастановы Сакратарыяту ЦК КП(б)Б ад 1 лістапада 30 г.—правядзеньне месячніку „Часопісь „Беларуская Работніца і Сялянка“—у масы“ пачаць з 15-га лістапада

ПАДПІСВАЙЦЕСЯ СВАЯЧАСОВА на СЬНЕЖАНЬ на газэту „ЗЬВЯЗДА“
(Орган ЦК КП(б)Б)
Свячасовая падпіска ГАРАНТУЕ АКУРАТНУЮ ДАСТАЎКУ газэты з 1-га сьнежня.

Беларускі нацыянал-дэмакратызм і вялікарасійскі шавінізм на ідэалёгічным фронце БССР

Я. СЯКЕРСКАЯ

Сучасны этап будаўніцтва сацыялістычнага грамадзтва, этап разгорнутага наступленьня на капіталістычныя элементы праходзіць ва ўмовах жорсткага і складанага, адкрытага і скрытага клясавага змаганьня.

У нацыянальных рэспубліках нашага Саюзу клясавае змаганьне набывае спэцыфічны характар. Гэтае змаганьне праяўляецца на ідэалёгічным фронце у першую чаргу ў форме розьнага роду шавінізму, пачынаючы ад вялікарасійскага шавінізму і канчаючы ўсімі відамі мясцовага шавінізму (украінскага, беларускага, польскага, яўрэйскага і т. д.), накіроўваючы вострасьць свайго змаганьня супроць ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Процэс СВУ на Украіне і дзейнасьць контр - рэвалюцыйнага нацыянал-дэмакратызму у БССР—яркія прыклады на агульным фоне жорсткага клясавага змаганьня, накіраванага супроць дыктатуры пралетарыяту.

Таксама як і ва ўсім нашым Саюзе, так і ў Савецкай Беларусі галоўнай небясьпекай зьяўляецца, відома, вялікадзяржаўны шавінізм, ён зьяўляецца галоўнай небясьпекай і таму, што адстроўвае інтарэсы найбольш моцных клясаў, клясаў раней панаваўшай нацыі, і таму, што мы яшчэ дахёка ня вырашылі задачу ліквідацыі шматвяковае спадчыны эканамічнай і культурнай адсталасьці раней прыгнечаных нацый, і таму (гэта адносіцца ў асаблівасьці да БССР), што мясцовы нацыянал - дэмакратызм значна больш выкрыты, партыя супроць яго больш узброена, чым гэта мае месца ў адносінах да вялікарасійскага шавінізму і, нарэшце, таму, што вялікарасійскі шавінізм жыве сабою ва ўмовах нацыянальных рэспублік усе віды шавінізму.

Гэта, відома, не выключае таго, што ў нацыянальных рэспубліках на паўных этапах найбольш актыўна выступае мясцовы нацыянал - дэмакратызм, прычым выступае часта ў блёку з вялікадзяржаўным шавінізмам. Магчымасьць такога роду блёку дана самай клясавай сутнасьцю ўсякага роду шавінізму і суадносінамі клясавых сіл у нашай краіне.

Калі істотнае адрозьненьне вялікарасійскага шавінізму ад мясцовых шавінізмаў зводзіцца да таго, што першы «адлюстроўвае імкненьне аджываючых клясаў панзаваўшай раней вялікарасійскай нацыі вярнуць сабе страчаныя прывілеі» (Сталін), а другі «адлюстроўвае незадавальненьне аджываючых клясаў раней прыгнечаных нацый рэжымам дыктатуры пралетарыяту» (Сталін), дык яднае іх насьмяленна агульнасьць клясавых інтарэсаў, у агульным змаганьні супроць дыктатуры пралетарыяту, за адналеньне капіталізму.

У сувязі-ж з бурным

БЯЗЬЛІТАСНА БІЦЬ ПА ТЫХ, ХТО ІМКНЕЦЦА РЭВІЗАВАЦЬ ЛЕНІНСКУЮ НАЦЫЯНАЛЬНУЮ ПАЛІТЫКУ ПАРТЫІ

Канцэнтруючы агонь на вялікадзяржаўным расійскім шавінізьме, які зьяўляецца галоўнай небясьпекай, мы павінны і надалей узмацняць барацьбу з беларускім контр-рэвалюцыйным нацыянал-дэмакратызмам, нацыяналізмамі іншых колераў і прымірэнцтвам да іх

ДРУК СЛАБА ПЕРАКЛЮЧАЕЦЦА

НА ВЫКАНАНЬНЕ ПАСТАНОЎ ПАРТЫІ ПА НАЦПЫТАНЬНІ

«Пленум ухваляе ініцыятыву Фрунзаўскага і Кастрычніцкага РК КП(б)Б, якія правялі месячнік праверкі беларусізацыі і прапануе усім партыйным арганізацыям павесьці аправедную работу па праверцы становішча беларусізацыі і работы сярод нацменшасьцяй на працягу сьнежня месяца, абʼяднаўшы яе з масавай растлумачальнай работай аб задачах і мэтах нацпалітыкі ў БССР». (З пастановы пленуму).

Кастрычніцкі пленум ЦК КП(б)Б вынес рад практычных мерапрыемстваў па ажыцьцяўленьні ленінская нацыянальнай палітыкі партыі. Завастрыў увагу ўсе партыі на неабходнасьці жорсткага змаганьня супроць вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, супроць беларускага нацыянал-дэмакратызму, шавінізму розных колераў і прымірэнчых да іх адносін.

Асабліва важнае месца ў пастанове пленуму на нацыянальным пытаньні займае больш рашучае праведзеньне беларусізацыі. Пленум адзначае: «неабходна узмацніць барацьбу за поўную беларусізацыю як дзяржаўнага, так і гаспадарчага апарату». Як адно з практычных мерапрыемстваў па ажыцьцяўленьні нацпалітыкі партыі, пленум паставіў правесьці месячнік праверкі беларусізацыі і работы сярод нацменшасьцяй. У выкананьні гэтай задачы друк адыграе вялізарнае значэньне. Аднак, праведжаныя газеты «Рабочий», «Чырвоная Зьмена», «Савецкая Беларусь» гаворяць за тое, што яны яшчэ не перакуліся тварам да выкананьня гэтай пастановы.

Газеты «Рабочий» і «Чырвоная Зьмена» на працягу апошняга месяца ні словам не абмовіліся аб месячніку праверкі беларусізацыі, нібы гэта іх не датычыць. Яны абмежаваліся тым, што зьмясьцілі на сваіх старонках некалькі беларусізацыі, вафіксавалі факт і на тым скончылі справу. Палосы гэтых газет кажуць аб тым, што рэдакцыі не паставілі ў центр увагі гэтыя палітычныя задачы.

Яшчэ горшы малюнак прадстаўляе «Савецкая Беларусь». Яна зусім засталася «глухой» і бястурботнай да важнейшага палітычнага пытаньня, якое высунуў пленум ЦК КП(б)Б. Яна не зьмясьціла ніводнай заметкі аб ходзе беларусізацыі. Газэта не сыгналізуе аб прарывах, якія ёсьць у паасобных зьвеньнях нашага апарату, яна не вядзе ўпартага штодзеннага змаганьня з вялікадзяржаўным шавінізмам, як галоўнай небясьпекай, беларускім нацыянал-дэмакратызмам і шавінізмамі іншых народнасьцяй.

Ні адна з газэт не праводзіць масавай апэрацыйнай работы па вырашэньні гэтага пытаньня. Трэба рашуча перакласьціцца на папулярызацыю важнейшай пастановы партыі аб праверцы беларусізацыі і работы сярод нацменшасьцяй. Газэты павінны стаць на праўдзівыя арганізатарамі ў гэтай важнейшай палітычнай кампаніі.

Ня лепш справа стаіць у гэтых газэтах і з папулярызацыяй пастаноў пленуму. «Савецкая Беларусь» і «Рабочий» абмежаваліся тым, што зьмясьцілі афіцыяльны матар'ял пленуму. «Чырвоная Зьмена» зусім моўчкі абыйшла пастановы пленуму і не вядзе ніякай работы сярод камсамольскіх мас па іх папулярызацыі.

«Зьвязда» на сваіх старонках ня раз узьнімала пытаньне аб тым, што газэты павінны адыграць вялізарную ролю ў папулярызацыі пастаноў пленуму з тым, каб давесьці іх да кожнага партыйца, кожнага рабочага, калгасьніка і бяднякa-серадняцкіх мас вёскі. Аднак, на сёньняшні дзень мы ня маем ніякіх даных аб тым, што газэты вядуць якую-небудзь работу ў гэтым напрамку.

Патрэбна зараз-жа зрабіць рашучы пералом. Газэты на сваіх старонках павінны шырока асьвятляць работу ніза вых партʼячэек па папулярызацыі пастаноў пленуму. Газэты павінны дапамагчы ўсёй партарганізацыі, шляхам зьмяшчэньня раду артыкулаў, у праведзеньні растлумачальнай работы па гэтым пытаньні.

ХАЛЕПА.

„ШАВІНІЗМ, ЯКОЙ-БЫ ЁН МАСЬЦІ НЯ БЫЎ, АРГАНІЧНА УЛАСЬЦІВЫ ДРОБНАЙ БУРЖУАЗІІ, АДНАК, ЁН ПРАСОЧВАЕЦЦА І У РАДЫ ПАРТЫІ, ЗАРАЖАЮЧЫ ПААСОБНЫХ РАБОТНІКАЎ, ПААСОБНЫЯ ЗЬВЕНЬНІ І ПРАСЛОЙКІ ПАРТЫІ НАЦЫЯНАЛІСТЫЧНЫМІ ПОГЛЯДАМІ, ЯКІЯ НІЧОГА АГУЛЬНАГА З ЛЕНІНІЗМАМ І МАРКСЫЗМАМ НЯ МАЮЦЬ“ (З РЭЗАЛЮЦЫІ ПЛЕНУМУ ЦК КП(б)Б па ДАКЛАДУ т. ГЕЯ).

Мацней удар па нацыянальных ухілах

Ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі партыі немагчыма без упартага штодзеннага змаганьня з рознага роду адхіленьнямі ад лініі партыі.

Кастрычніцкі пленум ЦК КП(б)Б асабліва выразна падкрэсьліў у рэзалюцыі па дакладу т. ГЕЯ, што ўстаноўкі XVI партыйнага зьезду УсеКП(б) па нацпытаньні цалкам і поўнасьцю адпавядаюць умовам і абставінам Беларусі.

Вялікія посьпехі сацбудаўніцтва, якія мы маем, тлумачацца тым, што партыя ўпарта ажыцьцяўляе генэральную лінію, рашуча змагаючыся з правым ухілам, які зьяўляецца галоўнай небясьпекай, з рэцыдывамі трацкізму, рознага роду «лявацкімі» ухіламі, якія за апошні час зблёкаваліся з правымі.

Вялікадзяржаўны шавінізм, як і мясцовы беларускі нацыянал-дэмакратызм і шавінізмы ўсіх колераў, мае сацыяльныя карэньні адпаведныя: «сацыяльныя карэньні розных шавінізмаў заключаюцца ў тым, што шавінізм вялікадзяржаўны і мясцовы маюць агульна-клясавыя карэньні. Кожны шавінізм ёсьць буржуазная, дробна-буржуазная і кулацкая ідэалёгія» (Пленум ЦК КП(б)Б).

Адсюль зусім зразумелым становіцца тое, што ўскрыя праяўленьні шавінізму у якой бы там ня было форме зьяўляюцца праяўленьнем клясавага змаганьня, — вылазкай клясава-варожых нам элемэнтаў.

Факты, якія друкуюцца сёньня аб праявах вялікадзяржаўнага шавінізму, з усёй яскравасьцю гавораць за тое, што вялікадзяржаўны шавінізм як і мясцовыя нацыяналізмы, абараняючы свой контр-рэвалюцыйны твар, скрываецца пад рознага роду «рэвалюцыйнымі» фразамі. Абураючыя факты праяў вялікадзяржаўнага шавінізму на чыгунцы сьведчаць нам аб тым, што сям-там гэты шавінізм пусьціў моцныя шчупальцы ў паасобныя, менш устойлівыя, зьвеньні нашай партыі, а таксама і сярод паасобных членаў партыі. Гэтым махровым вялікадзяржаўным шавіністам высунулі нават тэорыю, што беларуская мова зьяўляецца пагібельлю для транспарту (!?). Такую тэорыю высоўвае член партыі. Кіраўніцтва партколектыву не дае рашаючага адпору гэтай вялікадзяржаўна-шавіністычнай «тэорыі». Рад фактаў «очковтирательства» з праведзеньнем беларусізацыі (на паперы ўсё добра, а іншы раз і на паперы грубыя скрыўленьні), таксама сьведчыць аб тым, што гэта ёсьць нішто іншае, як праяўленьне вялікадзяржаўнага шавінізму. Усе гэтыя факты з усёй яскравасьцю гавораць за тое, што частка партыйных ячэек і нават паасобных камітэтаў ня ўсвоіла важнейшых пастаноў партыі аб змаганьні з вялікадзяржаўным шавінізмам, які зьяўляецца галоўнай небясьпекай на даным этапе.

Паасобныя партыйныя ячэйкі падыходзяць па-дзяцьку да практычнага вырашэньня нацыянальнай палітыкі партыі. Яны абмяжоўваюцца заслухоўваньнем дакладаў, уключэньнем у план работы нацыянальнага пытаньня, а па сутнасьці ў штодзённай рабоце нічога ня робяць, не вядуць штодзённага ўпартага змаганьня з рознага роду нацыяналістычнымі ўхіламі і не вядуць штодзённай працы ў галіне інтэрнацыянальнага выхаваньня.

Спасыланьне на «аб'ектыўныя» прычыны, на загружанасьць работай, няўменьне спалучыць праведзеньне нацпалітыкі партыі з важнейшымі задачамі сацбудаўніцтва — ёсьць нішто іншае як спроба замаскаваць апартунізм і аб'ектыўнае натуральнае клясаваму ворагу.

Бальшавіцкае вырашэньне задач нацпалітыкі партыі немагчыма без штодзённай, упартай барацьбы з рознага роду адхіленьнямі ад яе. Партыя на ўсім сваім гістарычным этапе вяла змаганьне на два фронты як з пэксімбурлізмам (нігілізмам у нацпытаньні), у тым ліку, з вялікадзяржаўнай розневідасьцю яго, які мяскаваўся пад «левай» фразай (Пятакоў, Букарын), так і супроць «аўстрамарксыцкага», меншавіцка-бундаўскага вырашэньня нацпытаньня. Партыя вяла і будзе весьці змаганьне з рознага роду скрыўленьнямі ленінскай лініі ў нацпытаньні. Канцэнтруючы агонь па вялікадзяржаўным шавінізьме, які зьяўляецца галоўнай небясьпекай, мы павінны ўзмацняць далей змаганьне з контр-рэвалюцыйным беларускім нацыянал-дэмакратызмам, шавінізмамі ўсіх колераў і прымірэнчымі да іх адносінамі. Пастановы пленуму аб тым, што погляды нацыянал-апартунізму несумяшчальны з прыналежнасьцю да КП(б)Б — абавязваюць кожнага камуністага шляхам бальшавіцкай самакрытыкі выкрываць і зьнішчаць усё тое, што перашкаджае ажыцьцяўленьню нацыянальнай палітыкі партыі. Партарганізацыі павінны рашуча дастасаваць гэту пастанову да тых, хто ня хоча і не праводзіць лініі нашай партыі, хто патурае клясаваму ворагу, хто паслабляе пасьпяховае ажыцьцяўленьне задач сацбудаўніцтва.

Выкрыць клясава варожы твар

шавіністых і прымірэнцаў

На агульным сходзе работнікаў Менскага політэхнікуму, справаздачу аб выніках абсьледваньня работы мясцкому рабіла прадстаўніца брыгады—настаўніца політэхнікуму т. Хімава. Усю справаздачу яна рабіла на расійскай мове, а заключае слова на польскай, ня гледзячы на тое, што польскай мовы з прысутных ніхто не разумеў. Адзін выкладчык—Брохэс, на другі дзень пасьля сходу, заявіў, што ён ня хоча слухаць польскай мовы. Калі яму паказалі на тое, што гэта ёсьць сваяасаблівае праяўленьне шавінізму, ён заявіў: «я не шавіністы але палякаў ня люблю, бо я ніколі яшчэ ня сустрэў ніводнага «порядочного» поляка». Трэба адзначыць, што сярод некаторых супрацоўнікаў тэхнікуму гэты выкладчык сустракае спачуваньне. Некаторыя супрацоўнікі прабуюць гэтаму шавіністычнаму выступленьню надаць «рэвалюцыйную афарбоўку». Над ідэям таго, што нібы яны добра памятаюць дваццаты год, беларускую акупацыю, апраўдваюць выступленьне Брохэса. Для ўсіх гэтых шавіністых польская нацыянальнасьць прадстаўляе сабой толькі беларыпяку, яны ня хочуць бачыць клясавага змаганьня. Для іх польская нацыянальнасьць—гэта шляхта. Рабочых і асноўных мас селяньства яны не заўважаюць. Для іх не існуе таго гэрачнага змаганьня, якое вядуць рабочыя, у сакоо з асноўнымі масамі селяньства, пад кіраўніцтвам партыі, супроць польскага фашызму. Яны ня бачаць таго актыўнага ўдзелу, які прымаюць працоўныя польскія масы па будаўніцтве сацыялізму ў нашай краіне.

Апрача гэтых яўна шавіністычных настрояў, у тэхнікуме ёсьць «балотныя» настроі, як спачуваньне Брохэсу, нежаданьне выступаць супроць яго на асабістых матывах. Па такіх настроях партколектыў, як сьлед, ня ўдарыў.

Адначасова трэба адзначыць, што т. Хімава направільна падышла да сходу, калі прабіла заключае слова на польскай мове, добра ведаючы, што з прысутных, не амаль ніхто не разумее. Гэты факт таксама нельга кваліфікаваць, інакш, як сваяасаблівае праяўленьне польскага шавінізму.

Асноўныя масы настаўніцтва, безумоўна, працуюць разам з партыяй, пад яе кіраўніцтвам, і савецкай уладай над вырашэньнем асноўных задач, якія стаяць перад нашай краінай. Выпадак у Менскім політэхнікуме сыгналізуе нам, што некаторая частка інтэлігенцыі не разумее, або не жадае праводзіць палітыкі партыі ў нацыянальным пытаньні. Трэба мабілізаваць шырокія масы савецкай грамадзянасьці на змаганьне з правямі рознага роду шавінізму, асабліва з вялікадзяржаўным, які зьяўляецца галоўнай небясьпекай, а таксама і шавінізмамі іншых колераў. Партакалектыў політэхнікуму, в таксама і прафсаюзныя арганізацыі павінны разгарнуць шырокую работу па інтэрнацыянальным выхаваньні, а таксама і завастрыць увагу на мёртвых месцах шавіністычных выпадках з тым, каб яшчэ энэргічней змагацца за ажыцьцяўленьне нацпалітыкі партыі.

К.

Вялікадзяржаўныя шавіністыя узьнялі галаву

Апошні пленум ЦК КП(б)Б асабліва завастрыў увагу ўсёй партыі па неабходнасьць узмацненьня змаганьня з адхіленьнямі ад нацыянальнай палітыкі партыі. Галоўную небясьпеку на даным этапе прадстаўляе вялікадзяржаўны шавінізм. Гэта абазначае ўсю партыю сканцэнтраваць галоўны ўдар на вялікадзяржаўны шавінізм, аднак, ні на хвіліну не аслабляючы змаганьня з контр-рэвалюцыйным беларускім нацыянал-дэмакратызмам, шавінізмамі ўсіх колераў і прымірэнчымі да іх адносінамі.

Як-жа ажыцьцяўляецца ленінская нацпалітыка нашай партыі на Менскім чыгуначным вузле. Адказ просты. Мы маем ідэю рад скажэньняў лініі партыі у нацыянальным пытаньні. Асноўным зьяўляецца тое, што бюро парткалектыву не мабілізавала масы на змаганьне з узьняўшым галаву вялікадзяржаўным шавінізмам. Кіраўніцтва парткалектыву ня стала на чале ўпартага штодзённага змаганьня з рознага роду адхіленьнямі ад лініі партыі ў нацыянальным пытаньні.

Бюрократычныя элемэнты — вялікадзяржаўныя шавіністы на чыгунцы за апошні час асабліва зандла выступаюць супроць нацпалітыкі партыі. Начальнік станцыі, член партыі, Зантовіч высунуў тэзіса вялікадзяржаўна-шавіністычную «тэорыю», што «калі даваць распараджэньне ніжэйшаму персаналу на беларускай мове, то гэта зьяўляецца пагібельлю для транспарту». Гэты вялікадзяржаўны шавіністы імкнецца прыкрыць свой шавіністычны твар змаганьнем за выразнасьць работы транспарту і выступае пад сьцягам інтэрнацыяналізму. Па сутнасьці гэта толькі «левыя» фразы, за якімі хаваецца твар махровага вялікадзяржаўнага шавіністага. Па прыкладзе начальніка станцыі менш адказныя асобы таксама разьвіваюць сваяасаблівыя тэорыі, што «ўжываньне беларускай мовы зьяўляецца перашкодай у выкананьні прамфінпляну». А начальнік станцыі Менск-таварная проста заяўляе: «у нас нічога беларуская няма, яшчэ не атрымалі загаду аб ужываньні беларускай мовы». Гэтыя «тэорыі» вялікадзяржаўных шавіністых не атрымалі руйнуючага адпору з боку партыйнага калектыву. Кіраўніцтва парткалектыву ня толькі не растлумачыла рабочым масам ікодпасьці і сабрала работнікаў Менскага політэхнікуму, справаздачу аб выніках абсьледваньня работы мясцкому рабіла прадстаўніца брыгады—настаўніца політэхнікуму т. Хімава. Усю справаздачу яна рабіла на расійскай мове, а заключае слова на польскай, ня гледзячы на тое, што польскай мовы з прысутных ніхто не разумеў. Адзін выкладчык—Брохэс, на другі дзень пасьля сходу, заявіў, што ён ня хоча слухаць польскай мовы. Калі яму паказалі на тое, што гэта ёсьць сваяасаблівае праяўленьне шавінізму, ён заявіў: «я не шавіністы але палякаў ня люблю, бо я ніколі яшчэ ня сустрэў ніводнага «порядочного» поляка». Трэба адзначыць, што сярод некаторых супрацоўнікаў тэхнікуму гэты выкладчык сустракае спачуваньне. Некаторыя супрацоўнікі прабуюць гэтаму шавіністычнаму выступленьню надаць «рэвалюцыйную афарбоўку». Над ідэям таго, што нібы яны добра памятаюць дваццаты год, беларускую акупацыю, апраўдваюць выступленьне Брохэса. Для ўсіх гэтых шавіністых польская нацыянальнасьць прадстаўляе сабой толькі беларыпяку, яны ня хочуць бачыць клясавага змаганьня. Для іх польская нацыянальнасьць—гэта шляхта. Рабочых і асноўных мас селяньства яны не заўважаюць. Для іх не існуе таго гэрачнага змаганьня, якое вядуць рабочыя, у сакоо з асноўнымі масамі селяньства, пад кіраўніцтвам партыі, супроць польскага фашызму. Яны ня бачаць таго актыўнага ўдзелу, які прымаюць працоўныя польскія масы па будаўніцтве сацыялізму ў нашай краіне.

Апрача гэтых яўна шавіністычных настрояў, у тэхнікуме ёсьць «балотныя» настроі, як спачуваньне Брохэсу, нежаданьне выступаць супроць яго на асабістых матывах. Па такіх настроях партколектыў, як сьлед, ня ўдарыў.

Адначасова трэба адзначыць, што т. Хімава направільна падышла да сходу, калі прабіла заключае слова на польскай мове, добра ведаючы, што з прысутных, не амаль ніхто не разумее. Гэты факт таксама нельга кваліфікаваць, інакш, як сваяасаблівае праяўленьне польскага шавінізму.

Асноўныя масы настаўніцтва, безумоўна, працуюць разам з партыяй, пад яе кіраўніцтвам, і савецкай уладай над вырашэньнем асноўных задач, якія стаяць перад нашай краінай. Выпадак у Менскім політэхнікуме сыгналізуе нам, што некаторая частка інтэлігенцыі не разумее, або не жадае праводзіць палітыкі партыі ў нацыянальным пытаньні. Трэба мабілізаваць шырокія масы савецкай грамадзянасьці на змаганьне з правямі рознага роду шавінізму, асабліва з вялікадзяржаўным, які зьяўляецца галоўнай небясьпекай, а таксама і шавінізмамі іншых колераў. Партакалектыў політэхнікуму, в таксама і прафсаюзныя арганізацыі павінны разгарнуць шырокую работу па інтэрнацыянальным выхаваньні, а таксама і завастрыць увагу на мёртвых месцах шавіністычных выпадках з тым, каб яшчэ энэргічней змагацца за ажыцьцяўленьне нацпалітыкі партыі.

К.

Не далі руйнуючага адпору праявам шавінізму

„Мову ведаем, гаварыць ня хочам“

У Наркамгандлю ўсе работнікі гавораць па-расійску—і нават тады, калі да іх зварачаюцца з запытаньнямі на беларускай мове.

На пытаньне: чаму вы адказваеце па-расійску, яны адказваюць:

— Гэта старая традыцыя, у нас усе гавораць па-расійску і нам цяжка адказваць па беларускай мове.

Парткалектыў у гэтым напрамку зрабіў мала чаго. Растлумачальная работа вядзецца, бо амаль ні адзін работнік не ведае, што ўхвалілі па гэтым пытаньні пленум ЦК КП(б)Б. У выніку—праявы самага махровага нацыянал-дэмакратызму і вялікадзяржаўнага шавінізму. Так, напрыклад, тэхнік-лаўнік — Ракаў на запытаньне брыгады: якая розьніца паміж нашай беларускай і заходня - беларускай (фашысцкай) культурай,—адказае: розьніцы ніякае няма... Далей, на пытаньне—якую-ж мы будзем культуру, пралетарскую, альбо якую-нідзь іншую, ён адказвае: вы яшчэ не ведаеце, што пабудуецце пралетарскую культуру.

Тэхнік Ракаў ведае беларускую мову, но гаворыць:

— «Я не собираюсь быть рупором белорусизации. Мне, как и другим нашим работникам, легче говорить по-русски. Без нажима сверху, или же по приказу нашей администрации я не буду белоруссифицироваться».

Гэтыя адказы тэхніка Ракава сьведчаць аб тым, што ніякае работы па беларусізацыі ў Наркамгандлю не вядзецца.

Вось другі, ня менш цікавы выпадак. Генералёка ад Ракава адышоў кансультант Імпартнага аддзелу—Ратнер. Той гаворыць:

— «Хорошо говорю и пишу на белорусском языке, но говорить я на нем не буду, а если заставят—буду говорить исключительно по-еврейски».

Парткалектыў гэтыя факты выкрыў, але супроць іх ня ўзьнята грамадзянскасьць і гэтыя вялікадзяржаўныя шавіністыя спакойна сядзяць ка сваіх мясцох.

Парткалектыў абмежаваўся толькі тым, што за апошнія два месяцы паставіў адзін раз на сваім пасяджэньні пытаньне аб беларусізацыі.

Калі ў сакратара парткалектыву запыталі: чаму-ж усё-такі вы нічога ня робіце па беларусізацыі, ён адказаў:

— Мы працуем паводле пляну райкому партыі.

Прыходзіцца рабіць вывад, што райком ня цікавіцца гэтым пытаньнем (!). Такім чынам, сакратар парткалектыву сваю віну хоча перакласьці на плечы райкому партыі, які, да рэчы, даў цэлы рад канкрэтных дырэктыў па нацыянальным пытаньні.

Мы лічым, што такія агартуністы-чныя адносіны да пастаноў пленуму ЦК КП(б)Б з боку мясцкому і парткалектыву Наркамгандлю—недапушчальны. Райком партыі павінен неадкладна ўжыць усе меры да аздаравленьня кіраўніцтва ячэйкі Наркамгандлю, якая ня выконвае важнейшых пастаноў партыі.

Адміністрацыя павінна поўнасьцю скарыстаць свае правы для таго, каб прымусіць усіх супрацоўнікаў ужываць беларускую мову.

Брыгадзір «Зьвязды»—
ТАЎКАЧОЎ.

Беларусізацыя на закутках

На фабрыцы «Гэрой Працы» не клапоцяцца аб тым, каб беларусізацыя, гэта важнейшае зьяўнае нацыянальнай палітыкі КП(б)Б—праводзілася ў жыцьцё. На фабрыцы больш 80 проц. работных-беларусы. Аднак, партыйныя і камсамольскія арганізацыі мала дбаюць пра беларусізацыю і абмяжоўваюцца выключна беларускімі пратаколамі, гэта значыць, паслугамі тэхнічнага сакратара... Яны хаваюцца за барыкады пратаколаў ад вырашэньня на сутнасьці справы беларусізацыі.

Адсюль уся культурна-масавая работа, работа клюбу, усе сходы і пасяджэньні праводзяцца выключна на расійскай мове. Беларуская слова туды трапляе проста выпадкова.

Усе пасьпеўныя газэты выдаюцца на расійскай мове і толькі час ад часу там зьмяшчаюцца лёзунг, або артыкул на беларускай мове.

Шматтыражка «Чырвоная Бракамолка» фармальна—«перакладным шляхам»—беларусізавана на 70 проц.

Тлумачыцца ўсё гэта і тым, што частка актыву не зразумела задач у галіне беларусізацыі, і адсутнасьць яе прабуе вытлумачыць адсутнасьцю беларускфіх п'ес у клюбе і гуртка па беларусізацыі. Ёсьць, нават, настроі падаваць беларусізацыю ў «грамах», па рацэнту. Насьцьценгазэты кажуць, будзем беларусізаваць ад процанту да процанту, вельмі паступова...

Пастановы пленуму ЦК КП(б)Б па нацыянальным пытаньні не давядзены да рабочага. Яны не пастаўлены ў рабочых масах для неадкладнага праведзеньня ў работе.

Беларускай пралетарскай літаратуры ў бібліятэцы фабрычнага клюбу няма. Усяго некалькі старых беларускіх кніжок выпадкова заваляліся ў шафе. Падбор літаратуры і закупка яе робіцца самацёкам і чамусьці беларуская літаратура ў большасьці зусім выпадае.

Клюб упрыгожаны выключна расійскімі лёзунгамі і калі ёсьць беларускія, дык адзін-два, якія трапілі, каб фармальна прыкрыць «работнічкаў» ад вырашэньня па-ленінску нацыянальнага пытаньня.

